

Наша Слова



БЕЛАРУСЬ АДБУДУЕ МОЛАДЗЬ Стар.2.

ЧАМУ СЛАБАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ САМАСВЯДОМАСЦЬ? Стар.4.

Штотыднёвік (Выходзіць з сакавіка 1990 г.) **№ 43 (307)** 24 — 30 кастрычніка 1996 г. Кошт -- 1000 рублёў

ПОСТУП ТЫДНЯ

○ **У Менску прайшоў** Нацыянальны кангрэс у падтрымку Канстытуцыі супраць дыктатуры, а таксама шматтысячны мітынг прыхільнікаў дэмакратыі. У суботу ж і нядзелю ў Палацы спорту праходзіў Усебеларускі народны сход, на якім Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка пагадзіўся з Вярхоўным Саветам, каб 24 лістапада адбыўся рэспубліканскі рэферэндум. Пра што гаварыў Прэзідэнт на Усебеларускім народным сходзе, можна прачытаць у рэспубліканскіх газетах, якія выйшлі ў свет у нядзелю, 20 кастрычніка.

○ ***Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны і Таварыства беларускай школы распачалі збор подпісаў*** *пад патрабаваннем да Прэзідэнта і ўрада краіны забяспечыць грамадзянам Беларусі канстытуцыйнае права на атрыманне вышэйшай адукацыі на беларускай мове. Закон аб мовах, разлічаны на 10 гадоў, не выконваўся і ў лепшыя часы, а сёння і зусім забыты.*

○ **14 кастрычніка наша краіна святкавала новае свята** — Дзень маці.

○ ***Менскаму міжнароднаму адукацыйнаму цэнтру споўнілася два гады.*** *За гэты час у цэнтры мелі кантакты паміж сабой палітыкі, дэпутаты, бізнесмены, журналісты, студэнты — звыш 20 тысяч чалавек.*

○ **На канец кастрычніка запланаваны** візіт беларускай дэлегацыі на чале з першым намеснікам міністра знешніх эканамічных сувязяў А.Дабрашудравым у шведскі горад Крысціанштат. Мяркуецца адкрыццё ў Швецыі беларускага гандлёвага бюро.

○ ***Выканаўчым камітэтам Партыі разумнага сэнсу*** *(старшыня Іван Каравайчык) прынята рашэнне аб стварэнні Камітэта па правах чалавека. Старшынём яго прызначаная беспартыйная Кацярына Садоўская.*

○ **Як стала вядома з Дзяржкамдруку Рэспублікі Беларусь**, усур'ёз абмяркоўваецца ідэя выдання літаратурна-мастацкага часопіса "Иностранная литература" (заснавальнікам яго будзе выдавецтва "Мастацкая літаратура"). Пакуль што часопіс існуе ў праекце, і таму яшчэ дакладна невядома, на якой мове ён будзе выходзіць: толькі на расійскай або на расійскай і беларускай. Але назва часопіса "Иностранная литература", здаецца, гаворыць сама за сябе...

○ ***У Менску прайшоў*** *Другі міжнародны фестываль монаспектакляў "Я". У ім удзельнічалі артысты з Беларусі, Расіі, Украіны, Балгарыі, Польшчы, Кіпра, Летувы і Казахстана. Лаўрэатам фестывалю стала вядомая актрыса Дзяржаўнага маладзёжнага тэатра Алена Унукава.*

○ **У друку з'явілася інфармацыя**, што накладам у 87 тысяч паасобнікаў у свет выходзіць кніга "Первый Президент Республики Беларусь". Для России — тиражом 120 тысяч. Аўтар шэдэўра — Уладзімір Якутаў.

○ ***Вуліца ў Менску****, размешчаная ў раёне праспекта Машэрава, цяпер будзе называцца Іерусалімскай. Ганаровая цырымонія адкрыцця памятнай дошкі, якая апавяшчае аб тым, што яна названа ў гонар 3000-годдзя Іерусаліма, адбылася 17 кастрычніка ў прысутнасці прадстаўнікоў Менскага гарвыканкама, пасольства дзяржавы Ізраіль і грамадскасці сталіцы.*

Супрацьстаянне не перарасло ў крывавы канфлікт

Чаканне крывавай развязкі канфлікту паміж Прэзідэнтам і парламентам на працягу апошняга тыдня трымала ў напружанні ўсю краіну. Сёння з палёгкаю можна сказаць — самага страшнага не адбылося.

У пятніцу сілы аб'яднанай апазіцыі правялі Нацыянальны кангрэс у абарону Канстытуцыі. У ім узяло ўдзел звыш 1200 дэлегатаў з усёй краіны. Былі прадстаўнікі ад усіх буйных палітычных партый (акрамя камуністаў), грамадскіх арганізацый, працоўных калектываў і прафсаюзаў. Можна з упэўненасцю сказаць, што па сваёй легітымнасці ні ў чым не саступаў "народному собранию". Кангрэс не ставіў за мэту прыняцце рашэнняў, якія бы мелі сілу законаў.

Палітыкі з рознымі поглядамі былі адзінадушныя ў ацэнцы становішча, у якім апынулася Беларусь дзякуючы намаганням Прэзідэнта і яго каманды. Вынікі двухгадовага кіравання А.Лукашэнкі гавораць самі за сябе. Замежныя крэдыты ідуць на будаўніцтва катэджаў, штодзённа парушаюцца правы чалавека, ідзе разбурэнне асноў беларускай дзяржаўнасці, эканомікі і нацыянальнай культуры.

Аб гэтым з трыбуны кангрэса гаварылі Генадзь Карпенка, Юрый Хадыка, Станіслаў Шушкевіч, Аляксандр Бухвостаў, Ніл Гілевіч і іншыя выступоўцы. Суботні мітынг стаў лагічным працягам кангрэса. Да апошняга часу было невядома, што рыхтуюць мітынгоўцам "стратэгі" з прэзідэнцкай адміністрацыі, ці здольныя яны пераступіць апошнюю мяжу і праліць кроў? Мяркуючы па колькасці грузавікоў са спецназам, БТРаў і іншай вайсковай тэхнікі, што з"явіліся на менскіх вуліцах раніцай 19 кастрычніка, такі план у іх быў. Напярэдадні газета "Свабода" апублікавала дакладную запіску палкоўніка ўнутраных войскаў А.Шкуна сваймy начальству, у якой гэты ваяка рапартаваў, што снайперы і аўтаматчыкі падрыхтаваны і гатовы адкрыць агонь. Расійскіх інструктараў спецназа, якія маюць баявы досвед, планавалася выкарыстаць ва ўсіх падраздзяленнях. Быў разгорнуты і канцлагер на 2,5 тысячы вязняў.

Але ўсіх людзей ужо запалохаць немагчыма. Звыш 15 тысяч чалавек прыйшло раніцай 19-га на плошчу Я. Коласа — месца збору маніфестантаў. Ёсць звесткі, што ў гэты дзень у школах горада былі зачынены дзверы і школь-

(Заканчэнне на с.2.)

Навіны "Бацькаўшчыны"

5-6 кастрычніка ў Менску прайшла арганізаваная Згуртаваннем беларусаў свету "Бацькаўшчына" навукова-практычная канферэнцыя "Культура і адукацыя беларускага замежжа". Яе правядзенне стала вынікам ажыццяўлення пастановы "Бацькаўшчыны" аб правядзенні раз на два гады падобных сустрэчаў, першая з якіх адбылася ў 1994 годзе.

Да ўдзелу ў сёлетняй канферэнцыі былі запрошаныя звыш сотні асобаў — сябры беларускіх суполак і навукоўцы як з Беларусі, так і з іншых краінаў — ЗША, Канады, Латвіі, Летувы, Малдовы, Польшчы, Расіі, Украіны, Францыі, Эстоніі. На жаль, прыехаць на яе здолелі не ўсе запрошаныя, бо аплаціць іхнія выдаткі на ўдзел у сустрэчы "Бацькаўшчына" не змагла, а Міністэрства культуры не захацела. Нягледзячы на гэта, беларускае замежжа на канферэнцыі было прадстаўлена вельмі шырока — колькасць яе ўдзельнікаў склала 160 асобаў.

У першы дзень канферэнцыі адбылося пленарнае пасяджэнне яе ўдзельнікаў, якія чыталі свае даклады і паведамленні. А ўвечары сабраныя ўшанавалі дзеячаў беларускай культуры замежжа, якія сёлета сталі юбілярамі — Янку Запрудніка (ЗША) і Аляксандра Надсана (Вялікая Брытанія), якія адзначылі 70-годдзе, ды Сакрата Яновіча (Польшча), якому споўнілася 60.

Наступным днём працавалі дзве секцыі — блізкага і далёкага замежжа. Інтарэс навукоўцаў да канферэнцыі аказаўся нечакана вялікім. У выніку, нават нягледзячы на адсутнасць часткі запрошаных, не ўсім прысутным хапіла часу на ўдзел у дыскусіях. Гэта дазволіла арганізатарам канферэнцыі меркаваць, што наступная падобная сустрэча акажацца не менш цікавай і плённай.

Нечакана для ўсіх правядзенне канферэнцыі стварыла праблемы для "Бацькаўшчыны".

— Мы не маем магчымасці выдаваць матэрыялы беларускага замежжа. Гэтаму замінае існаванне ў краіне цэнзуры, — сказала ў час гутаркі з карэспандэнтам "Нашага слова" старшыня Рады "Бацькаўшчыны" сп-ня Г.Сурмач. — Сёлета, — працягнула яна, — мы планавалі выдаць кнігу пра Беларусь амерыканскага даследчыка Янкі Запрудніка, але зрабіць гэта "Бацькаўшчыне" не дазволілі. Таму ёсць падставы чакаць, што складанасці ўзнікнуць і з выданнем матэрыялаў канферэнцыі. Нягледзячы на гэта, вывучэнне культуры беларускага замежжа будзе актыўна працягвацца і надалей.

Часткаю беларускіх арганізацыяў замежжа — удзельніц канферэнцыі былі атрыманыя ўрадавыя запрашэнні да ўдзелу ў так званым "Всебелорусском собрании". Удзельнікамі канферэнцыі была прынятая заява пра адмаўленне ад удзелу ў гэтай акцыі.

6 кастрычніка адбылося пасяджэнне Вялікай і Малой Радаў Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына".

На пасяджэнні Вялікай Рады было абмеркаванае пытанне аб даце і месцы правядзення з'езда беларусаў свету. Вялікай Радай прынята рашэнне правесці чарговы з'езд 26-27 ліпеня наступнага года ў Менску. Разам з тым прадугледжана магчымасць змены даты і месца з'езда ў выпадку, калі з нейкіх прычынаў правядзенне яго ў сталіцы стане немагчымым.

На пасяджэнні Малой Рады "Бацькаўшчыны" прынятае рашэнне пачаць падрыхтоўку да з'езда. Створаны яго арганізацыйны камітэт, ганаровым старшынём якога стаў Васіль Быкаў, а сустаршынямі — прэзідэнт "Бацькаўшчыны" Радзім Гарэцкі і Пётр Краўчанка.

Галоўнай тэмай з'езда стане захаванне ў свеце беларускай прысутнасці і стварэнне фонду дзеля яе падтрымкі.

У.П.

На здымку: Прэзідыум канферэнцыі: акадэмік **Радзім Гарэцкі**, доктар **Янка Запруднік**, старшыня Рады "Бацькаўшчыны" **Ганна Сурмач**, прафесар **Анатоль Сабалеўскі**.

Фота У.КАРМІЛКІНА.

Рэха

Балюча, трывожна за Беларусь

Людзі добрыя, якія вы розныя! І як па-рознаму выкарыстоўваецца вялікі боскі дар — слова! Зноў гвалтоўна навязваецца рэферэндум. Натоўпам прапануецца прымаць такую складанейшую рэч, як Канстытуцыя! Дзеля чаго? Зноў — тое ж самае спадзяванне на натоўп, які сам сябе можа "здаць" у рабства. І вось па радыё, па дзяржаўным тэлебачанні ідзе, нясецца шквал прамоў, разлічаных на атуманьванне розуму. Ні селянін, ні рабочы, ні нават служачы, каго ўмоўна называюць інтэлігентам, не ў сілах уцяміць сакрэт усіх прапагандысцкіх штучак. Ён не прывучаны ўглядацца ў газетныя артыкулы ды разгадваць палітычныя галаваломкі. Да таго ж, ён карыстаецца нейкім адным выданнем, накшталт "Советской Белоруссии", "Народнай газеты" ці нават раёнкі, бо ў ёй ёсць мясцовыя навіны, праграма тэлебачання, каб з'арыентавацца, калі на экране будзе "Новая ахвяра". Ён замбіраваны, адурманены. Таму як скажа начальства ісці на рэферэндум — пойдзе. Скажуць выкрасліць у бюлетэні тое ці іншае пытанне — будзе зроблена. Скажуць, напрыклад, з'явіцца на вылучэнне ўдзельніка Усебеларускага сходу — з'явіцца. А там рукой махне, маўляў, няхай начальнік будзе дэлегатам — той, мабыць, і праект Канстытуцыі чытаў... А просты чалавек? А хто яго будзе слухаць? Што ён здольны зрабіць?

А вось і зрабіў. Зрабіў, калі выбраў Прэзідэнта. Каб той за яго думаў. Ды ачніцеся вы, людзі добрыя!

Можа б і ачнуліся... Але ж апанентаў думкі Прэзідэнта не чуваць па радыё. І вось пануе народная бяздумнасць, даверлівасць і санлівасць як новы шанс для прэзідэнцкай каманды. Працоўнаму люду не выпадае мысліць. Ён увесь час у барацьбе за існаванне. Ён корміць сябе і таго, хто ім кіруе. Яму трэба неяк пратрымацца фізічна. Ён есць, спіць і зноў працуе. На знос. На яго сумна глядзець. Нярэдка просты чалавек сваім жабрачым выглядам выклікае роспач. І расце, расце колькасць алкаголікаў, знясіленых, скалечаных духоўна і фізічна людзей! А ў дзверы каго з простых працаўнікоў зараз не стукаецца беднасць? Не іграе ролі і перадрэферэндная прэзідэнцкая дапамога бюджэтнікам. У моры — кропля. Людзі жартуюць: гэта — сродак для таго, каб дажыць як-небудзь да рэферэндуму, паспець падтрымаць "бацькаву канстытуцыю". А там... Адкуль возьмуцца заробкі, калі прадпрыемствы — банкруты?

І вось у гэты трывожны, балючы час беларускі радыё-тэлеэфір захлёбваецца плынню дыялогаў, прамоў па ўхваленні толькі прэзідэнцкага праекта Канстытуцыі. Толькі яго! Ваяўнічая самаўпэўненасць прамоўцаў даходзіць да пажаданняў ажно ўвядзення спецартыкула аб забароне выданняў кніг патрыётаў-пісьменнікаў! Якім тут жа навешваюцца ярлыкі супрацоўніцтва з фашыстамі. Артыкула аб забароне гістарычнай сімволікі і нават аб абмежаванні... правоў каталіцкай канфесіі, веравызнання, нібыта шкоднага для Беларусі.

Думаю, што гэта зрабілася з ваяўнічымі атэістамі, з тымі людзьмі, якія ўвогуле не маюць ніякіх адносін да рэлігіі? Парабіліся веруючымі?! А ў што яны сталі раптам верыць?

Людзі добрыя, як за вас маліцца?

ПАМАЖЫ НАМ, БОГ!

Будзь са мной надзея,
што з усіх дарог
мы аднойчы скажам:
"Памажы нам, Бог!
Адрадзі наш голас,
каб звінець ён мог
пакаяльнай просьбай —
"Памагай нам, Бог!"
Дух усюды існы,
міласэрны Бог,
узвядзі нас, Ойча,
на святы парог,
каб уголас кожны
памаліцца змог:
"Ты даруй нам, Божа,
памажы нам, Бог!
Узляці, малітва,
над смугой дарог,
дзе — адвечны голас:
"Памагай нам, Бог!"
Ты пачуй, збавіцель,
памажы, Ісус!
Ды ўваскрэсне духам
кожны Беларус!

Марыя БАРАВІК.
м.Падсвілле.

Янка ЗАПРУДНІК:

Беларусь адбудуе моладзь



Янка Запруднік (сапр. імя і прозвішча Сяргей Вільчыцкі, паэтычны псеўданім Ясень) — вядомы вучоны, пісьменнік, грамадска-палітычны дзеяч беларускага замежжа. На эміграцыі з 1944 года. Прымаў удзел у Першым з'ездзе беларусаў свету (1993) і ў тых прэс-канферэнцыях, якія ладзілі беларускія ўрадоўцы сумесна з інтэлектуаламі беларускага замежжа для журналістаў і на якіх ён выказаў уласныя прапановы і меркаванні наконт духоўнага, эканамічнага і дзяржаўнага адраджэння Бацькаўшчыны. Нацыянальныя інтарэсы беларускага народа Янка Запруднік абараняе паслядоўна на працягу многіх гадоў. Сёлета з нагоды ягонага 70-гадовага юбілею ў музеі Нацыянальнага навукова-асветнага цэнтра імя Скарыны адкрыта выстава, а ў сталічным Доме літаратара з вялікім поспехам прайшла вечарына.

Гутарка з Янкам Запруднікам запісана на Міжнароднай канферэнцыі "Культура і адукацыя беларускага замежжа", якая адбылася 5-6 кастрычніка г.г. у Менску.

— Спадар Запруднік, якія Вашы ўражанні ад сустрэчы з сённяшняй Беларуссю, што Вы ў нас убачылі і пачулі?

— Я да вас прыехаў 20 верасня, браў удзел у канферэнцыі на тэму грамадзянскай супольнасці, затым паехаў з жонкай да сваякоў у Мір, у Баранавічы і ў Жыткавічы. Учора і сёння — я на канферэнцыі "Культура і адукацыя беларускага замежжа". Уражанні такія: перш-наперш тут холадна і ў прамым сэнсе, і ў пераносным. Але вось, як бачым, людзі і ў гэтым холадзе неяк выжываюць і змагаюцца, знаходзяць крыніцы цяпла. У пераносным сэнсе крыніца цяпла — гэта Беларусь, якая змагаецца за сваё "Я", за сваё існаванне, сваю культуру, духоўную базу, на якой трэба адбудоўваць эканоміку. Тут атрымліваецца нейкая такая перакуленая не па-марксісцку структура: у аснове — дух, а наверсе — эканоміка. І жыццё паказала, што марксісцкая формула не спрацоўвае. Трэба, відавочна, не культуру на эканоміцы базаваць, а эканоміку — на культуры. Хоць, па-праўдзе кажучы, абодва складнікі звязаны арганічна. Не можа быць багатай культуры без багатай эканомікі. Гэта ўсведамляюць усе, у тым ліку і Прэзідэнт Лукашэнка, які сказаў, што мы будзем багатыя культурна, калі будзем багатыя эканамічна. На жаль, у яго не выходзіць ні з адным, ні з другім. Ён і культуру гэтую здушвае наніз, і з эканомікай у яго нічога не выходзіць, і яна наніз ідзе. Такое ўражанне ад сённяшняй Беларусі. Але ж я сустракаўся з маладымі беларусамі, некаторыя з якіх былі ў замежжы, бачылі, як пабудавана рэшта свету, і ў гутарцы з імі набраўся аптымізму: пабачыў, што расце здаровая маладая змена, частка якой вельмі добра разумее вартасць нацыянальнай культуры, нацыянальнай ідэі.

— А зараз да Вас пытанне як да юбіляра: што Вам удалося здзейсніць на беларускай ніве ў творчым і ў грамадскім планах?

— Пражыўшы семдзесят гадоў і займаючыся беларускай справай ад васемнаццацігадовага ўзросту, ёсць пра што ўспомніць і што пералічыць. Мне, бадай, будзе цяжка назваць усё, што ўдалося здзейсніць, аднак паспрабую. Быў я актыўным на ніве журналістыкі — трыццаць сем гадоў адпрацаваў каментатарам на радыё "Вызваленне", якое пазней стала называцца "Свабодай". Пятнаццаць гадоў рэдагаваў газету "Беларус", працаваў і працую ў беларуска-амерыканскіх арганізацыях, з'яўляюся сябрам управы "Беларуска-амерыканскага "Задзіночання" і ўправы Беларускага інстытута навукі і мастацтва, уваходжу ў Раду Беларускай Народнай Рэспублікі. Я выкладаў расійскую, савецкую гісторыю ў Нью-Йоркскім універсітэце, курс гісторыі і палітыкі Беларусі ў Калумбійскім універсітэце і ў інстытуце імя Гарымана (Гарыман быў паслом ЗША ў СССР — І.К.). З'яўляюся аўтарам кніжкі па гісторыі Беларусі, якая павінна выйсці ў Менску ў беларускім перакладзе з англійскай мовы, з дадатковым раздзелам пра апошнія падзеі на Бацькаўшчыне. Напісаў шэраг артыкулаў пра Беларусь для амерыканскіх энцыклапедый, цяпер апрацоўваю гістарычны слоўнік Беларусі, які выйдзе ў серыі "Гістарычныя еўрапейскія слоўнікі" і які мушу скончыць да сярэдзіны наступнага года. Гэта праца складаецца з храналогіі, уводнага артыкула на старонак трыццаць, слоўнікавай часткі і даволі дэтальнай бібліяграфіі з дваццаццю падраздзеламі. Цяпер рэдагую альбом, прысвечаны дваццаці тром гадавым мастацкім выставам, якія адбываліся ў штаце Нью-Джэрсі. Бяру ўдзел у розных канферэнцыях. Так, у лістападзе г.г. прыму ўдзел у канферэнцыі на з'ездзе амерыканскіх славістаў у Бостане. Тэма майго выступлення "Роля гістарычнай веды ў адбудове беларускай дзяржаўнасці". Вось больш-менш пра тое, што мне ўдалося здзейсніць.

— А паэзія Сяргея Ясеня?

— Паэзія — занятак маёй маладосці, хоць і цяпер часамі нейкія такія накіды напрошваюцца. Сёння пры маёй занятасці іншымі справамі я пакідаю паэзію маладым паэтам Беларусі, сярод якіх ёсць выдатныя. Я вельмі зацікаўлены ў іхняй дзейнасці, у іхняй працы і думаю пра іх са спадзяваннем.

— Раскажыце пра ўдзел амерыканскіх беларусаў у палітычным і грамадскім жыцці.

— Мы, беларусы Амерыкі, падтрымліваем кантакты з амерыканскімі ўрадавымі і палітычнымі коламі, бяром удзел у перадвыбарчай прэзідэнцкай кампаніі, трымаем лучнасць з Дзяржаўным дэпартаментам Злучаных Штатаў Амерыкі, з кангрэсменамі і сенатарамі тых штатаў, дзе жывуць беларусы,— а жывуць яны ў асноўным у штатах Нью-Джэрсі, Нью-Йорк, Агаё, Каліфорнія і інш., інфармуем улады пра развіццё падзеяў на Беларусі, даём сваё разуменне гэтых падзеяў, спрыяючы станаўленню беларускай дзяржаўнасці і беларускай культуры, дэмакратызацыі грамадства і адраджэнню эканомікі і т.п.

— Значыць, у эканамічным плане Вы таксама нейкім чынам уплываеце на справы Беларусі? Памятаецца, у Вас былі адпаведныя праекты, з якімі Вы прыязджалі на Першы з'езд беларусаў свету.

— Перш-наперш мы стараемся, каб у Беларусь ішла дапамога ахвярам чарнобыльскай катастрофы, асабліва дзецям, і пашыраем звесткі пра яе вынікі. У Дзяржаўным дэпартаменце ЗША дамагаемся, каб Беларусь не была абыдзена ў размеркаванні дапамогі, што ідзе ў краіны былога СССР. Эканамічны аспект нашай дзейнасці ў дадзенай сітуацыі звужаны, паколькі амерыканскія бізнесмены інвестуюць свае капіталы ў краіны з дэмакратычным ладам, дзе іхнія ўкладанні гарантаваны не амонаўцамі, не войскам, а законамі. Гэта адна з дэталяў, якой, на жаль, не разумее Прэзідэнт Лукашэнка, які запэўніваў амерыканскіх бізнесменаў тут, у Менску, што іхнія ўклады будуць гарантаваны войскам. Але яны не такія наіўныя людзі, каб не разумець, што найлепшая гарантыя іхніх укладаў — гэта адпаведнае заканадаўства, якога, на жаль, на Беларусі яшчэ няма, ну, і, пэўна ж, няма яшчэ волі вашага ўрада праводзіць рынычныя рэформы.

— А як складваюцца Вашы кантакты з нацыянальнымі цэнтрамі на Беларусі?

— У асноўным мы кантактуем з усімі такімі установамі. Напрыклад, мой сябра, старшыня Беларускага інстытута навукі і мастацтва ў Нью-Йорку Вітаўт Кіпель, заступнікам якога я з'яўляюся, вельмі актыўна рассылае нашы выданні па беларускіх бібліятэках і універсітэтах: у Гомель, Гародню, Полацк, Віцебск, Менск і іншыя гарады. Мы кантактуем са Скарынавым цэнтрам і Згуртаваннем беларусаў свету "Бацькаўшчына", з нацыянальнай бібліятэкай, якой хачу цяпер перадаць дзве свае кніжкі. Адна з іх — пра гісторыю, палітыку і эканоміку Беларусі выйшла пад назвай "Беларусь на гістарычным скрыжаванні" (1993), другая — "Беларусь і Малдова" (1995) — выйшла ў выдавецтве кангрэсавай бібліятэкі ЗША і адрасуецца дыпламатам Дзяржаўнага дэпартамента дзеля азнаямлення з гэтымі краінамі. Мы трымаем таксама кантакты з беларускімі скаўтамі, з Беларускім Народным Фронтам "Адраджэньне", з усімі дэмакратычнымі арганізацыямі: сацыял-дэмакратамі, хрысціянскімі дэмакратамі, Беларускай сацыял-дэмакратычнай Грамадой, з газетамі "Свабода", "Літаратура і мастацтва" і "Наша слова". Пра вашу газету магу сказаць, што яна публікуе вельмі патрэбныя матэрыялы, і я ведаю, што ў Амерыцы беларусы з вялікай ахвотай яе чытаюць, сочаць па ёй за ходам падзей, за станам беларускай мовы. Ну, і затым мы трымаем кантакты з некаторымі шпіталямі, куды пасылаем лекі. Вось, прыкладам, мы з жонкай зараз цікавіліся, ці дайшла да Жыткавіцкага шпіталя тая дапамога, якую мы яму ахвяравалі.

— Цікава, а яна дайшла?

— На жаль, многае не дайшло. Цяжка сказаць, што ў вас робіцца, чаму дапамога не даходзіць туды, куды пасылаецца.

— Скажыце колькі слоў пра тое, што плануеце здзейсніць.

— Перш-наперш мушу скончыць апрацоўку гістарычнага слоўніка Беларусі, а таксама рэдагаванне альбома, прысвечанага мастацкім выставам. У мяне моцнае жаданне напісаць гісторыю "Дванаццаткі" — пра незабыўны перыяд у маім жыцці.

— А што такое гісторыя "Дванаццаткі"?

— Гэта гісторыя пра дванаццаць юнакоў-бязбацькавічаў, якія, скончыўшы беларускую гімназію імя Я.Купалы ў Рэгенсбургу і Міхельсдорфе, у студзені 1948 года выехалі працаваць шахцёрамі ў Англію, дзе трымаліся разам і дагаварыліся нават з чужынкамі не жаніцца. Там мы выдавалі часопіс "Наперад", дзякуючы якому пра нас даведаліся беларускія студэнты Лювэнскага універсітэта з Бельгіі, пасля чаго мы знайшлі магчымасць далучыцца да іх.

— Вы скончылі Лювэнскі універсітэт?

— Я скончыў гістарычны факультэт гэтага універсітэта ў 1954 годзе.

— А бельгійскі фармацэўт спадар Клыбік таксама быў у ліку дванаццаці вашых сяброў?

— Не, не быў. Я з ім пазнаёміўся ўжо ў Бельгіі, калі жылі разам у адным студэнцкім доме. Там мы вучыліся і закончылі сваю навуку. Хачу яшчэ сказаць, што з намі быў кампазітар Мікола Равенскі. З трыццаці з нечым беларускіх хлопцаў і дзяўчат, што вучыліся ў Лювэнскім універсітэце, ён адабраў шаснаццаць асоб і ўтварыў беларускі хор. На пачатку пяцідзесятых гадоў мы выязджалі з гастролямі ў Бон, у Парыж, у Лондан — аж да смерці Равенскага ў 1953 годзе. Хачу дадаць да сказанага: чым больш трымаю лучнасць з Беларуссю, тым больш мяне цікавіць рэалізацыя тэмы "Беларуская нацыянальная ідэя і беларускі нацыяналізм", якую спадзяюся распрацаваць у аспекце ўзаемасувязі гэтых паняццяў: што гэта за канцэпцыя і якую ролю яна павінна адыгрываць у далейшым развіцці беларускай дзяржаўнасці.

— Мне вядома, што ў вайну Вы вучыліся ў Баранавіцкай беларускай прагімназіі. І я ў ёй вучылася — ці не ў адзін час з Вамі?

— Значыць, мы вучыліся ў адной школе. Прагімназію я закончыў у 1943 годзе, затым скончыў трэці курс гандлёвай школы, а тады, у канцы чэрвеня 1944 года, адбылася эвакуацыя. Паколькі я парушыў забарону партызан не вучыцца ў час акупацыі, і быў членам Саюза беларускай моладзі, то палічыў больш разумным выехаць на Захад.

— Ці сустракаліся Вы ў Штатах з лідэрам БНФ Зянонам Пазьняком?

— Вядома ж, мы сустракаемся. Дапамагаем яму і ў ролі перакладчыкаў, і ў ролі праваднікоў, бо англійскай мовы ён не ведае. Настрой у яго цяпер не просты, не лёгкі, але адначасна і аптымістычны. Пазьняк — вельмі загартаваны змагар, чалавек з моцным духам, і я думаю, што ён дасць рады ў новай сітуацыі.

— А як склалася яго матэрыяльнае становішча? Ці не давядзецца яму працаваць у шахтах, як калісь Вам?

— Яго матэрыяльнае становішча сапраўды цяжкае. У вас няправільна разумеюць, што амерыканская дзяржава разам са статусам палітычнага ўцекача яму дае нейкую дапамогу. Абсалютна ніякай дзяржаўнай дапамогі Пазьняк не атрымлівае. Яму давядзецца выжываць уласнымі сіламі.

— Што скажаце на развітанне?

— Перш-наперш хачу падзякаваць вам за інтэрв'ю. Я рады, што мы знайшлі дзеля гэтага вольную часінку. Беларусам Амерыкі вядома, што вашай рэдакцыі даводзіцца працаваць у незвычайна цяжкіх, экстрэмальна-цяжкіх абставінах. Мы гэта разумеем і са свайго боку стараемся, наколькі гэта магчыма, спрыяць вам і пачувацца разам з вамі. "Наша слова" — вельмі патрэбнае выданне, таму што мова — адна з асноў нашага існавання. Можа, не адзіная. Некаторыя, як мне здаецца, звужаюць базу нашай бытнасці, атаесамляючы яе толькі з мовай. Не! Я думаю, гэта база шырэйшая. Сам факт існавання дзяржаўнасці, якая б яна ні была, уплывае на светагляд маладых людзей. Я ў гэтым пераканаўся, сустракаючыся тут з маладымі расійскамоўнымі беларускімі незалежнікамі. Безумоўная рэч, мову трэба бараніць, развіваць, адстойваць,— тое, што вы робіце сёння. І мы ў гэтай справе будзем вас падтрымліваць маральна. Аднак трэба сваю базу крышачку шырэй браць, бо калі мы звужаем разуменне базы свайго існавання, мы асуджаем сябе на песімізм. А нам патрэбен аптымізм, нам патрэбна моц духу і нам трэба разумець сваю сітуацыю, можа, крышачку больш трывалую, чымся толькі самое існаванне мовы.

— І я Вам шчыра дзякую за гэту сустрэчу. А ад супрацоўнікаў нашага штотыднёвіка прыміце сардэчныя віншаванні з юбілеем і пажаданні асабістага шчасця і плёну ў працы.

Распытвала Ірына КРЭНЬ.

Зацікаўленая размова: **Радзім Гарэцкі, Янка Запруднік, Ніл Гілевіч.**

Фота У.КАРМІЛКІНА.

Супрацьстаянне не перарасло ў крывавы канфлікт

(Заканчэнне. Пачатак на с.1.)

нікаў не выпускалі з класаў, а ў ВНУ ішлі рэктарскія праверкі, тым не менш моладзі ў калонах было нямала.

Аб 11 гадзіне калоны па ходніках рушылі па праспекце Скарыны. Парадак пад час шэсця забяспечвала дружына. Ніякіх эксцэсаў не адбылося. Як мне здаецца, на паводзіны ўладаў паўплывала некалькі акалічнасцяў. Хутчэй за ўсё Лукашэнка не атрымаў дабро на любыя дзеянні ў Маскве, плюс дэмарш паслоў чатырох буйнейшых еўрапейскіх краінаў і безумоўна публікацыя вышэйназванага таемнага плана. На плошчы ля Опернага тэатра прысутнічала ўжо звыш 25 тысяч чалавек. Мітынг прайшоў досыць мірна, што гаворыць пра жаданне лідэраў апазіцыі любой цаной не дапусціць сутыкненняў дэманстрантаў з міліцыяй. Пасля мітынгу некалькі тысяч чалавек прыйшлі да павароту на праспект Машэрава і на працягу гадзіны дэманстравалі свае адносіны да ўдзельнікаў усебеларускага сходу. Усе подступы да Палаца спорту былі ачэпленыя войскамі, але ніхто яго штурмаваць не збіраўся, міліцыя спачатку паспрабавала адцясніць людзей у метро, аднак потым кінула гэты занятак. А 17-й гадзіне каля універсама "Рыга" сіламі АМАПа былі арыштаваныя сем маладых хлопцаў і дзяўчат, прадстаўнікоў федэрацыі анархістаў. Сярод затрыманых былі грамадзяне Расіі і Францыі. У панядзелак тры чалавекі былі асуджаныя на 5 сутак арышту і яшчэ трое атрымалі вялікія штрафы.

Альгерд НЕВЯРОЎСКІ.

Ці будзе ў нашай школе месца беларускай культуры і беларускай мове?

Сёння, калі ў рэспубліцы разгортваюцца працэсы вызначэння асноўных мэтаў і зместу маючай адбыцца рэформы агульнаадукацыйнай школы, у якасці аднаго з найгалоўнейшых паўстае пытанне аб месцы беларускай нацыянальнай культуры, увогуле, і беларускай мовы, у прыватнасці, у будучай пасляэформеннай агульнаадукацыйнай школе.

Яшчэ некалькі гадоў таму гэтае пытанне ў такой пастаноўцы здавалася штучным. У рэспубліцы дзейнічалі законы "Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь" і "Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь", якія дакладна вызначалі як месца беларускай культуры, так і месца беларускай мовы ў нашай адукацыйнай сістэме. Нагадаем толькі адзін з артыкулаў гэтых законаў, у адпаведнасці з якім школы ў Рэспубліцы Беларусь павінны былі працаваць на беларускай мове. У месцах кампактнага пражывання жыхароў іншай нацыянальнасці маглі ствараецца школы ці класы з расійскай ці іншай нацыянальнай мовай навучання. Зыходзячы з гэтых нарматыўных палажэнняў, Міністэрства адукацыі распрацавала як свае падыходы да месца беларускай нацыянальнай культуры і беларускай мовы ў нашай адукацыйнай сістэме, так і нарматыўную базу і змест сваёй дзейнасці.

Пазначым некаторыя з дасягненняў таго часу. Па-першае, у рэспубліцы былі распрацаваны навучальныя планы для школ з беларускай мовай навучання, для школ з расійскай мовай навучання і для школ з іншай (польскай, яўрэйскай, украінскай і г.д.) мовай навучання. Але ва ўсіх гэтых варыянтах адпаведна закону вывучэнне беларускай і расійскай моваў было абавязковым. Прычым яно прадугледжвалася ў аб'ёмах, дастатковых для таго, каб кожны выпускнік кожнай школы валодаў абедзвюма мовамі на ўзроўні, які дазваляў бы яму і працаваць, і выконваць свае грамадзянскія абавязкі, і рэалізаваць свае грамадзянскія правы на кожнай з іх у адпаведнасці з Законам аб мовах.

Па-другое, навуковымі калектывамі пад кіраўніцтвам В.Протчанкі і П.Шубы былі распрацаваны прынцыпова новыя падыходы да вывучэння абедзвюх моваў — беларускай і расійскай. Гэтыя канцэпцыі характарызаваліся з аднаго боку, апораю пры вывучэнні другой мовы на асноўную — на мову навучання, а з другога боку, так званым камунікатыўна-дзейсным падыходам, пры якім галоўным было вывучэнне мовы як сродку ажыццяўлення камунікатыўных і прафесійных функцый чалавека.

Па-трэцяе, у гэтыя гады абмяркоўвалася рашэнне (здавалася б, відавочна слушнае, але дагэтуль так і не прынятае) аб вывучэнні прадметаў нацыянальна-культурнай спецыфікі (гісторыі Беларусі, геаграфіі Беларусі і г.д) толькі на беларускай мове, незалежна ад мовы навучання ў той ці іншай школе.

Па-чацвёртае, прынцыповай перапрацоўцы падлеглі праграмы вывучэння беларускай літаратуры. Не спыняючыся на ўсіх асаблівасцях новых праграм, падкрэслю толькі тое, што ў школах з беларускай мовай навучання творы сусветнай літаратуры, якія былі ўключаныя ў змест літаратурнай адукацыі, павінны былі вывучацца ў курсе беларускай літаратуры, гэта значыць, на беларускай мове.

Калі дадаць сюды значнае павелічэнне ролі прадметаў нацыянальна-культурнай спецыфікі і пашырэнне іх наменклатуры, увядзенне абавязковых экзаменаў беларускай мовы ды гісторыі Беларусі ў дзевятым і беларускай літаратуры ў адзінаццатым класах, дык становіцца відавочным, што гэта была праграма стварэння ў поўным сэнсе гэтага слова нацыянальнай сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь. Статус беларускай мовы ў школах стаў адным з вышэйшых.

Мэтанакіраваная дзейнасць міністэрства, органаў кіравання адукацыяй на месцах, адміністрацыі школ, дзяржаўная падтрымка гэтых працэсаў на ўзроўні заканадаўчай і выканаўчай уладаў вялі да таго, што бацькі ўсвядомілі сэнс гэтых працэсаў. Без асаблівых ваганняў яны аддавалі сваіх дзетак у беларускамоўныя класы. Нагадаем, што на пачатак 1994/95 навучальнага года колькасць вучняў у першых беларускамоўных класах дасягнула 76%, што прыблізна адпавядала нацыянальнаму складу насельніцтва краіны. І, што цікава, колькасць скаргаў у міністэрства на парушэнне правоў бацькоў на навучанне сваіх дзетак на расійскай мове лічылася адзінкамі і ішлі гэтыя скаргі галоўным чынам з месцаў, у якіх была значная колькасць вайскоўцаў расійскай арміі. Гэтыя праблемы вырашаліся з улікам пажаданняў бацькоў і патрабаванняў законаў. Таму гаварыць сёння аб гвалтоўнай беларусізацыі ў 1991-94 гадах азначае альбо не ведаць, альбо наўмысна скажаць сутнасць працэсаў таго часу.

Сітуацыя значна змянілася пасля травеньскага 1995 г. рэферэндуму. Не будзем цяпер абмяркоўваць яго, гэтага рэферэндуму, мэтазгоднасць — аб гэтым сказана столькі, што дадаць нешта новае ўжо немагчыма. Але, на мой погляд, рэч не толькі, а, магчыма, і не столькі, ў выніках рэферэндуму. Праблема з'яўляецца значна больш складанай. Яна — у падыходах да месца беларускай мовы ў грамадскім жыцці і, як вынік, у адукацыйнай сістэме.

Калі б і заканадаўчая, і выканаўчая ўлады па-сапраўднаму клапаціліся пра беларускую мову, дык яны як мага хутчэй далі б прававую інтэрпрэтацыю панняцця роўнага статуса беларускай і расійскай моваў, бо ў гэты тэрмін — роўны статус — можна ўкласці розны сэнс і ў адпаведнасці з гэтым па-рознаму вызначаць месца абедзвюх моваў у адукацыйнай сістэме. А сёння гэтая неафіцыйная, але дзеючая інтэрпрэтацыя скіраваная, па сутнасці, супраць беларускай мовы.

Патлумачу гэтую думку такім прыкладам. На спаборніцтвах па барацьбе ці боксе ніхто не патрабуе, каб спартсмен вагою 50 кг. уступіў у двубой са спартсменам вагою 100 кг, бо вынік магчымай барацьбы відавочны. Усе ўдзельнікі падзяляюцца на пэўныя вагавыя катэгорыі і пераможца ў кожнай з іх мае **роўны статус** з усімі астатнімі. І ніхто не бачыць тут няроўнасці, хаця, падкрэслю гэта яшчэ раз, пераможца ў найлягчэйшай вазе не ў стане спаборнічаць з пераможцам у найцяжэйшай вазе.

Калі правесці паралель з мовамі, дык трэба прызнаць, што беларуская мова не са сваёй віны і не згодна з вызначаным жаданнем народа на пачатку 90-ых гадоў прыйшла ў стан заняпаду ў параўнанні з расійскай мовай. І таму роўны статус моваў мусіў бы азначаць **фактычную значную няроўнасць на карысць беларускай мове** ў справе дзяржаўнай падтрымкі моваў. Гэты падыход мусіў быць зафіксаваным заканадаўствам, перакладзены ў нарматыўныя дакументы і ўведзены ў практыку дзеяння ўсіх органаў дзяржаўнай улады. Ці маем мы гэта сёння? Пытанне, як кажуць, для недасведчаных.

Міністэрства адукацыі і навукі з вядомых кан'юнктурных прычын палічыла за лепшае ніяк нарматыўна не вызначаць сваёй пазіцыі, спадзеючыся, што неяк яно будзе. І неяк яно ёсць. Паводле звестках таго ж міністэрства 1995/96 навучальны год пачаўся з колькасцю вучняў у першых беларускамоўных класах на ўзроўні 36%, 1996/97 — на ўзроўні 39%. Гэта — палова ці менш ад узроўню 1994 г. Пачаўся працэс разбурэння беларускамоўных 2-5 класаў. Непатрэбнымі аказаліся падручнікі, зноў панізіўся аўтарытэт беларускай мовы і настаўніка гэтай дысцыпліны. Паднялася хвала публікацый аб гвалтоўнай беларусізацыі. Што, народ раптоўна сам прыняў рашэнне аб беспярэстанкую беларускамоўнага навучання? А можа, праблема не ў жаданнях народа, а ў нечым іншым?

Нядаўна ў друку з'явілася распрацаваная Міністэрствам адукацыі і навукі і зацверджаная Кабінетам міністраў Канцэпцыя рэфармавання агульнаадукацыйнай школы. Але дарэмна будзе шукаць у ёй адказу на пытанне аб месцы беларускай нацыянальнай культуры, беларускай мовы ў будучай школе. Гэтае пытанне нават не згаданае ў Канцэпцыі, яго нібыта не існуе зусім. Што гэта — выпадковая недарэчнасць ці асэнсаваная пазіцыя? Хацелася б верыць у першае, але падзеі апошніх часоў не даюць да таго падставаў.

Адзін толькі прыклад. У канцы 1995 г. Міністэрства адукацыі і навукі раптоўна мяняе схему выпускных экзаменаў за курс сярэдняй школы, уводзячы ў школах з усімі мовамі навучання ў спіс абавязковых экзамен па расійскай мове. І толькі пад уціскам грамадскасці яно змяніла сваё рашэнне, дазволіўшы вучням выбіраць паміж расійскай і беларускай мовамі.

Здавалася б, пасля гэтага міністэрства стане больш уважліва ставіцца да пытання моваў. Але гэтак не адбылося.

У Канцэпцыі рэфармавання не пазначаная і праблема фармавання нацыянальнай самасвядомасці вучняў. Няма яе ні ў мэтах, ні ў змесце канцэпцыі рэфармавання.

Хацелася б, каб аўтары рэформы агульнаадукацыйнай школы зразумелі, што не існуе інтэрнацыянальных сістэм адукацыі. Кожная сістэма будуецца на дакладна вызначанай нацыянальнай культуры і толькі праз яе рухаецца да культуры сусветнай. На якой нацыянальнай культуры будзе будавацца сістэма адукацыі Рэспублікі Беларусь? На беларускай з дапаўненнем яе дасягненнямі культур іншых народаў нашай краіны і праз гэта да сусветнай культуры ці на іншай, напрыклад, на расійскай ці на польскай культуры з элементамі беларускай? Адказваць на гэтае пытанне ўсё адно давядзецца.

Але і прадстаўнікі Міністэрства адукацыі і навукі, і прадстаўнікі заканадаўчай і выканаўчай уладаў павінны зразумець: калі яны сёння па-сапраўднаму не падтрымаюць беларускую мову і беларускую культуру, дык можа здарыцца так, што праз 5-6 год і падтрымліваць ужо не будзе чаго. А гэтага гісторыя нам не даруе. У гісторыю можна ўвайсці, а можна і ўлезці. Думаць трэба сёння, каб не было сорамна і брыдка заўтра.

Г.ПЯТРОЎСКІ, прэзідэнт Таварыства беларускай школы.

З рэдакцыйнай пошты

Беларуская мова — не перашкода

Паважаная рэдакцыя, хачу з прыемнасцю адзначыць. што нам, групе навучэнцаў Менскага педагагічнага каледжа — будучым настаўнікам пачатковых класаў, выпала шчасце праходзіць педагагічную практыку ў СШ 86 г. Менска, дзе беларуская мова — у вялікай пашане. Узначальвае школу выкладчык беларускай мовы і літаратуры Шэндзераў Мікалай Уладзіміравіч, а намеснікай яго па рабоце з навучэнцамі пачатковых класаў з'яўляецца Ніна Васільеўна Цырліна,— выдатныя педагогі і шчырыя прапагандысты нацыянальнай культуры.

Прыгадваецца 2 верасня — пачатак новага навучальнага года. Вяла свята (гэта сапраўды было свята!) намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Калеснікава Валянціна Міхайлаўна. Усё тут радавала слых: і ёмістае беларускае слова, і мелодыі ў выкананні духавога аркестра, і звонкія дзіцячыя галасы. Быццам само сонейка асвятляла дарогу дзецям у вялікую Краіну Ведаў.

Пачаліся заняткі. Школа мае 13 беларускамоўных пачатковых класаў. І ўсё натуральна, прыстойна, ніхто ніякага дыскамфорту не адчувае: дзеці, іх бацькі, настаўнікі добра разумеюць адзін аднаго.

Міжволі задумваешся: чаму у іншых школах беларускамоўныя класы парасківалі? Хутчэй за ўсё гэта залежыць ад агульнага кіраўніцтва школы, ад педагагічнага калектыва ў цэлым. Выхаваныя бацькі школе давяраюць, а з тымі, хто карыстаецца "трасянкай", усё-такі трэба шмат працаваць. І тут, у 86-й школе, педагогі працуюць.

У пачатку верасня мы былі на практыцы, якая праходзіла пад дэвізам "Першыя дні дзіцяці ў школе". І прыемна адзначыць, што мы трапілі ў 1 "В"клас да маладой, але здольнай настаўніцы, выпускніцы нашага Менскага педагагічнага каледжа Астроўскай Таццяны Фамінічны.

Настаўніца выдатна валодае беларускай мовай, працэс навучання і выхавання яна вядзе так, што дзецям было ўсё зразумела, і яны з кожным днём — як гэта відаць у першым класе! — станавіліся ўсё больш арганізаванымі, засвойвалі патрэбны матэрыял, а беларуская мова не тое, што перашкаджала, а наадварот, спрыяла іх навучанню.

Увявіце сабе такі момант. У класе ціха. На партах ляжаць буквары. Настаўніца расказвае дзецям, як абыходзіцца з іх галоўнай кнігай, гартае і гаворыць:

Беражліва, беражліва я бяру старонку,
Беражліва, беражліва перагортваю яе.

Услед за ёю гэтыя словы паўтараюць усе першакласнікі. Таццяна Фамінічна вельмі цікава расказвала дзецям, якая мова і чаму называецца вуснай, якая пісьмовай.

А вось яшчэ фрагмент з урока. Ля дошкі настаўніца паставіла ў рад 12 выразаных цацак (зайцы, яблык, жолуд і інш.). Палічылі з дзецьмі, звяртаючы ўвагу на вымаўленне лікаў. Пытаецца:

— Я выставіла фігуркі. Колькі мы іх налічылі?

Дзеці нястройным хорам адказалі:

— Мы налічылі 12 фігурак.

Потым настаўніца яшчэ раз з дзецьмі палічыла цацкі, паказваючы на адну з фігурак два разы, каб атрымалася 13. Наступным разам яна прапусціла адну фігурку — і атрымалася 11. Такім чынам Таццяна Фамінічна пазнаёміла дзяцей з асноўнымі правіламі лічэння, якія былі сфармуляваныя так: ніякі прадмет нельга лічыць двойчы, ніякі прадмет нельга прапускаць, лічыць можна з любога прадмета і адказ атрымаецца правільны.

Цікава адзначыць тое, што ўсе дзеці паўтаралі правілы дакладна і даказвалі правільнасць адказу на цацках. Урок прайшоў вельмі цікава. І не заўважылі, як прабег час.

Аб рабоце настаўніцы ў першыя дні дзіцяці ў школе можна было б расказваць шмат. І кожны фрагмент урока па-свойму цікавы, займальны, ці гэта напружаная праца, ці хвілінка адпачынку:

Раз, два, тры, чатыры,
Зайчык вушы натапырыў,
Ідзе з лесу воўк, воўк,
І зубамі шчоўк, шчоўк...

Вельмі хочацца перадаць бацькам, якія баяцца аддаваць сваіх дзетак у класы з беларускай мовай навучання, што мова ў навучанні — не перашкода. У школе ўсё залежыць ад таго, хто вучыць і як вучыць.

Вікторыя ШЫМАНСКАЯ, навучэнка Менскага педагагічнага каледжа.

Псіхалагічнае спаемства

Да ўвагі тых, хто адчувае патрэбу ў беларускамоўнай дапамозе: ствараецца беларускамоўнае псіхалагічнае спаемства.

З якое нагоды ствараецца спаемства?

Шмат беларусаў, якія жадаюць размаўляць на роднай мове, не маюць галоўнага для гэтага: беларускамоўнага асяроддзя.

Адсутнасць умоваў дзеля ажыццяўлення нармальнага жадання, нармальнай патрэбы адмоўна адбіваецца на настроі, працаздольнасці, самаадчуванні.

Кожны чалавек мае права на самарэалізацыю. Мы дапамагаем знішчыць духоўную адзіноту, набыць плённасць у стасунках.

Як гэта робіцца?

Па спецыяльнай псіхалагічнай методыцы ствараецца беларускамоўнае асяроддзе, дзе кожны мае магчымасць выказаць свае думкі па хвалюючых яго пытаннях, распавесці пра свае сумненні альбо дасягненні, пераадолець бар'ер нерашучасці ва ўжыванні мовы, пашырыць свой слоўнікавы запас, знайсці аднадумцаў.

Адначасова ўдзельнікі будуць праходзіць практычныя заняткі па псіхалагічным удасканаленні асобы, развіцці здольнасцяў, падвышэнні творчых магчымасцяў.

Хто залічваецца ў моўна-псіхалагічнае спаемства?

Тыя, хто адчувае псіхалагічны дыскамфорт з прычыны адсутнасці беларускамоўнага асяроддзя;

Тыя, хто імкнецца пераадолець бар'ер нерашучасці ва ўжыванні мовы.

Што рабіць, каб залічыцца ў спаемства?

Патэлефанаваць у сераду з 18 да 20 гадзінаў па тэл. 265-74-12, каб запісацца на суразмову. Суразмова дае магчымасць вызначыць від дапамогі.

Неабавязкова пры запісе і на суразмове даваць свае пашпартныя звесткі, дапамога аказваецца бясплатна.

Кабінет сацыяльна-псіхалагічнай дапамогі, паліклініка № 28 г.Менска.

Дзяржаўная ці афіцыйная?

У праекце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, вынесеным на рэферэндум, які ініцыяваў Прэзідэнт, у артыкуле 17 запісана: "Дзяржаўнай мовай Рэспублікі Беларусь з'яўляецца беларуская мова. Руская мова мае роўны статус з беларускай". Што азначае роўны статус — там не сказана. Ці тут падкрэсліваецца большая важнасць беларускай мовы?

Прыгадваецца, што яшчэ ў Вярхоўнай Радзе XII склікання гучала прапанова беларускую мову пакінуць дзяржаўнай, расійскую — абвясціць афіцыйнай. Натуральна, адразу паўстала пытанне: чым розніца дзяржаўная мова ад афіцыйнай? Высвятляецца, што дзяржаўная мова — тая, на якой, прыкладам, выходзяць дзяржаўныя пастановы. Афіцыйная — тая, якая ўжываецца ў грамадстве афіцыйна.

Зараз у праекце Канстытуцыі, прапанаваным дэпутацкімі фракцыямі аграрыяў і камуністаў, у артыкуле 17 чытаем: "Беларуская і руская мовы з'яўляюцца афіцыйнымі мовамі Рэспублікі Беларусь". Пра дзяржаўную — гаворкі няма. Можна прапанаваць такі варыянт: дзяржаўнай мовай з'яўляецца беларуская; афіцыйныя мовы ў Беларусі — беларуская і расійская. Што я маю на ўвазе? Тут я бачу дзяржаўную мову як мову беларуская парламента, урадавых установ — ад мясцовага самакіравання да вышэйшых органаў улады, сродкаў масавай інфармацыі, сувязі і да т.п.

Важна падкрэсліць, што дзяржаўная мова — мова навучання. Але, калі ў Беларусі могуць існаваць польскія школы, дык чаму б не пакінуць невялікі працэнт расійскіх школаў і класаў, калі нейкія бацькі "ўпёрліся рогам", каб іх дзеці вучылі па-расійску. У нас такіх, хутчэй за ўсё, знойдзецца няшмат. Іх праблема, як такія дзеці потым мецьмуць моўную сувязь з тымі, хто вучыўся ў беларускай школе. Сапраўды, расійскамоўнаму інжынеру пры такім варыянце давядзецца працаваць з беларускамоўнай дакументацыяй. Ён скажа: я не ўсё разумею, бо не вучыўся па-беларуску. Беларускамоўны таксама мае права не ўжываць расійскай мовы. Дзе выйсце? Значыць, беларускую мову, як і расійскую, мусіць ведаць кожны.

Афіцыйныя мовы — тыя, якімі чалавек мае права свабодна карыстацца ў грамадстве. Увогуле, у прыватнай гамане, калі чалавека разумеюць,— ён можа гаварыць і на іншай мове. Спадзяванне на афіцыйнае ўжыванне грамадзянамі толькі адной беларускай мовы нерэальнае. Такое магчыма толькі ў перспектыве. Таму можна нават меркаваць, што дзве афіцыйныя мовы патрэбныя на пераходны перыяд. Гадоў на 15-20. Калі беларусы здолелі (хай пад прымусам) асвоіць мову Усходняй Русі, дык чаму цяпер, ва ўмовах дзяржаўнасці Беларусі, яны, як і ўсе грамадзяне нашай краіны, не могуць загаварыць па-беларуску?

Важнай умовай аб'яднання нацыі, ліквідацыі расколу ёсць пераход ад разнамоўя да беларускага аднамоўя. Нельга забываць, што іншыя мовы беларускаму народу ў гісторыі прышчэпліваліся часцей гвалтам. Беларуская мова ў нас адна. І ці захацелі б гадоў праз 100 выхаваны дзяржавай у патрыятычным духу беларусы вучыцца на чужой мове? Іншая справа — вывучаць замежныя мовы добраахвотна, у тым ліку і мову народа Усходняй краіны.

Генадзь КАЖАМЯКІН.

Меркаванні

Родная мова ў праектах новай Канстытуцыі

Успомнім, як доўга і ўпарта спрачаліся дэпутаты Вярхоўнага Савета Беларусі XII склікання над рэдакцыяй 17-га артыкула дзеючай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Нарэшце быў прыняты разумны варыянт: беларуская мова абвяшчалася дзяржаўнай, а расійская — сродкам міжнацыянальных зносін з гарантыяй яе вывучэння ў школах. Гэтага патрабавалі як маштабы русіфікацыі на Беларусі, схільнасць да яе пэўнай часткі насельніцтва і пражываючых у нас расіянаў, так званыя "нацыянальныя інтарэсы" тых, хто цяпер пры ўладзе. Беларуская мова як дзяржаўная атрымала перспектыву паступова і праз пэўны час вярнуцца ў грамадства і заняць у ім належнае становішча. Бо яна, дагэтуль найбольш трывала захоўваючыся ў асяроддзі пажылых людзей і абмежаванай групы патрыятычнай інтэлігенцыі (настаўнікаў, бібліятэкараў, працаўнікоў музеяў і архіваў, сумленных чыноўнікаў усіх узроўняў, журналістаў — ад ведамасных і раённых, абласных да дзяржаўных газет, радыё і тэлебачання) — тады шырока і паўсюдна ўваходзіла ў сістэму школьнага навучання і дзяржаўных установаў.

У прэзідэнцкім праекце Канстытуцыі РБ у гэтым жа артыкуле беларуская мова захавала сваю дзяржаўнасць, але такі статус атрымала і расійская. Гэта новы ўдар па нашай мове. Першы быў нанесены на рэферэндуме 1995 года, ад якога пачала разбурацца нацыянальная сістэма адукацыі. А.Лукашэнка ў Гародні гаварыў у тым сэнсе, маўляў, што дрэннага, што бацькам далі права выбіраць мову навучання сваіх дзяцей? Дрэнна тое, што зрусіфікаваныя не па сваёй ахвоце, а гістарычнымі ўмовамі беларусы цяпер самі ўзмацняюць гэты працэс. Дадзенае права прывяло толькі да таго, што многія бацькі з кан'юнктурных меркаванняў пачалі патрабаваць пераводу беларускамоўных класаў на расійскую мову выкладання, што абмяжоўвае або спыняе адраджэнне роднай мовы і духоўнасці. Што "вялікі і магутны" заціскае і прыгнятае меншую і больш слабейшую — даведзеную да такога стану неспрыяльнымі абставінамі мінулага — беларускую мову. Дазваляе ўсёй нашай кіруючай уладзе — зверху данізу — карыстацца ў РБ не мовай свайго народа і сваёй дзяржавы, а суседняй, што не спрыяе пашырэнню роднага слова, а падтрымлівае русіфікацыю Беларусі. У выніку губляецца не толькі нацыянальны твар дзяржавы, але робіцца праблематычнай выжыванне роднай мовы.

Доктар філалагічных навук Л.Выгонная ў часопісе "Роднае слова" (№ 2, 1996 г.) піша, што працэс вымірання моў адбываецца і ў XX стагоддзі. Гэта тлумачыцца "пашырэннем дамінантных моў (англійскай, расійскай) сродкамі масавай інфармацыі. Неспрыяльныя ўмовы для існавання роднай мовы назіраюцца ў буйных беларускіх гарадах. Гэтаму спрыяе выкарыстанне няроднай мовы ў інтэрнатах, каледжах і іншых навучальных установах залежных краін. Гэта назіраецца ў нас цяпер. Таму з новай рэдакцыяй 17-га артыкула пагадзіцца немагчыма.

Не задавальняе мяне фармуліроўка гэтага артыкула і ў праекце Канстытуцыі, які выносяць камуністы і аграрнікі на абмеркаванне. Народу прапануецца на рэферэндуме сваімі рукамі выкапаць яму сваёй роднай мове. У дзеючай Канстытуцыі РБ 17-ы артыкул найбольш дакладна выяўляе інтарэсы народа Рэспублікі Беларусь.

Міхаіл ПУЗІНОЎСКІ,
выдатнік народнай асветы.
г.Ашмяны.

Згадкі

Чаму ў нас слабая нацыянальная самасвядомасць?

Сучасны нацыянальны нігілізм, стан самасвядомасці беларускага народа, калі значная частка насельніцтва (асабліва жыхары гарадоў) саромеецца размаўляць на матчынай мове, ставіць пытанне: чаму склалася такая сітуацыя? У гэтым плане варта яшчэ раз уважліва прыглядзецца да гісторыі школьнага навучання ў нашай краіне.

У канцы XVIII ст. феадальна-шляхецкая Рэч Паспалітая, як вядома, была падзеленая паміж Аўстрыяй, Прусіяй і Расіяй. Беларусь была ўключаная ў склад апошняй.

Ліквідацыя Рэчы Паспалітай выклікала моцнае ўзрушэнне ў патрыятычна настроенага грамадства як Польшчы, так і Беларусі, прадстаўнікі якой (шляхта) лічылі сябе палякамі. Многія сталі шукаць сродкі, якія павінны былі, на іх думку, "аздаравіць грамадства і ўзняць польскі народ, польскую культуру і польскую дзяржаўнасць". "Хаця мы без Польшчы, аднак мы ў Польшчы",— гаварылі беларускія шляхцічы. Твары польскай і апалячанай беларускай шляхты з надзеяй павярнуліся да Вільні — сталіцы былога Вялікага Княства Літоўскага.

На пачатку 1803 г. Аляксандр I, які вёў палітыку "мяккай" асіміляцыі далучаных заходніх земляў, зацвердзіў новае палажэнне ў галіне асветы і адукацыі. Згодна яму, у прыватнасці, Галоўная школа Вялікага Княства Літоўскага, якая існавала з XVI ст. у Вільні, была пераўтвораная ва універсітэт, якому былі нададзеныя правы расійскіх універсітэтаў. Згодна з тагачаснымі законамі, статут універсітэта 1803 г. паставіў яго на чале адначасова ўтворанай з ім (універсітэтам) Віленскай навучальнай акругі. У склад акругі ўваходзілі навучальныя ўстановы Валынскай, Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Кіеўскай, Магілёўскай, Менскай і Падольскай губерняў, а з 1810 г. і Беластоцкай вобласці.

На чале акругі быў пастаўлены куратар (папячыцель). Ім стаў польскі магнат князь Адам-Ежы Чартарыйскі, які, карыстаючыся сяброўствам з Аляксандрам I, спадзяваўся, што яму ўдасца ажыццявіць сваю мару — аднавіць спачатку Польшчу, а потым і Рэч Паспалітую. Віленскі універсітэт і навучальныя ўстановы Віленскай навучальнай акругі зрабіліся ў руках А.Чартарыйскага і яго паплечнікаў-аднадумцаў галоўнай зброяй палітыкі выхавання падрастаючага пакалення Беларусі, Летувы і Украіны ў духу польскага патрыятызму. Навучанне вялося на польскай мове, беларуская мова і беларускае друкаванае слова не ўжываліся. Яны былі пазбаўлены права на самастойнае існаванне як з боку кіраўніцтва Віленскай навучальнай акругі, так і з боку расійскага царскага ўрада. Як польскія, так і расійскія вялікадзяржаўныя шавіністычныя колы размывалі, такім чынам, нацыянальны патэнцыял беларускага народа.

З утварэннем Віленскай навучальнай акругі на Беларусі актывізуецца маладзёжны рух, у прыватнасці сярод вучняў школ і гімназій. Ён меў культурна-асветніцкі накірунак у спалучэнні з палітычным і ставіў за мэту праз адукацыю і асвету выхаваць патрыятызм і, тым самым, захаваць сярод шляхецкай моладзі Беларусі польскую нацыянальную ідэю — адраджэнне Рэчы Паспалітай у межах 1772 г.

Асабліва вучнёўскі рух актывізуецца пасля 1807 г., што мела пад сабой рэальную аснову. Ён быў звязаны, перш за ўсё, з палітыкай французскага імператара Напалеона I ў адносінах да былой Рэчы Паспалітай. Напалеон, які ўжо бачыў сябе ўладаром Еўропы, распрацаваў планы заваявання Расіі. Каб аблегчыць сабе гэтую задачу, ён павёў палітыку, накіраваную на падтрымку і ўмацаванне ў польскай і беларускай шляхты надзеі на аднаўленне Рэчы Паспалітай.

У канцы 1806-га — пачатку 1807 гг. Напалеон стварыў з часткі польскіх земляў, якія адышлі да Прускага каралеўства пасля падзелу Рэчы Паспалітай і якія на гэты час былі ім (Напалеонам) акупаваныя, Герцагства (Княства) Варшаўскае і тым самым "даў надзею на аднаўленне Польшчы", Рэчы Паспалітай.

Гэтая падзея з'явілася імпульсам для ажыўлення польскага патрыятызму сярод вучнёўскай моладзі Беларусі. Так, адзін з вучняў Віленскай гімназіі пісаў у 1807 г.: "...Напалеон, жадаючы выканаць сваё абяцанне (адрадзіць Рэч Паспалітую — С.Т.), разбіў непрыяцельскія войскі (арміі Прусіі і Расіі — С.Т.), уваскрасіў імя паляка, утварыў Княства Варшаўскае. Тым самым ён абнадзеіў нас у паспяховым заканчэнні пачатай справы".

Натхнёныя ўтварэннем Герцагства Варшаўскага вучні Маладзечанскай павятовай школы пісалі на дошках: "Няхай жыве Напалеон!".

Прыкладна ў гэты час, як сведчыць сучаснік, у Нясвіжы "гімназісты і школьнікі вялікімі партыямі, пад кіраўніцтвам даміканскіх манахаў, хадзілі па гораду з барабанным пошчакам і ваяўнічымі выкрыкамі, неслі на шэстах стракатыя хусткі ў выглядзе сцягоў".

Не засталіся ўбаку і вучні Навагрудка, дзе ў пачатку 1809 г. узнік "Корпус вучняў павятовай школы", які аб'ядноўваў каля 100 навучэнцаў. Гэта была легальная забаўляльная вайскова-спартыўная арганізацыя. Яна ставіла за мэту праз вайсковыя спаборніцтвы — "бітвы", паходы, практыкаванні — захаваць польскі накірунак у патрыятычным выхаванні мясцовай моладзі. У складзе "Корпуса" існаваў аматарскі вучнёўскі тэатр, у якім ставіліся п'есы на польскай мове. Яны ў алегарычнай форме ўсхвалялі "слаўных палякаў" — польскіх палкаводцаў і каралёў, а таксама Напалеона, як будучага аднавіцеля Польшчы, Рэчы Паспалітай. Вучні ў сваім асяроддзі чыталі лекцыі аб вайне і "гулялі ў войска". З траўня 1810 г. адбылася сутычка членаў арганізацыі з расійскімі афіцэрамі пад час святкавання вучнямі канстытуцыі 1791 г., у выніку чаго арганізацыя была забароненая.

Вайна 1812 г., у якой актыўны ўдзел (як на баку Расіі, так і на баку Напалеона) прыняла шляхта Беларусі, замежныя паходы расійскай арміі, і, нарэшце, утварэнне ў 1814-1815 гг. Царства (Каралеўства) Польскага ў складзе Расійскай імперыі з'явіліся новым штуршком у актывізацыі польскага патрыятычнага руху на Беларусі. Назіраюцца больш смелыя ўчынкі вучнёўскай моладзі, якой здавалася, што ўтварэнне Царства Польскага — апошняя прыступка ў справе адраджэння Польшчы, а потым і Рэчы Паспалітай. У Маладзечне, у павятовай школе ў 1813 г. узнікае легальная арганізацыя "Войска Марса і Апалона", якая аб'ядноўвала 40 вучняў (у 1815 г. — 58) — дзяцей дробнай і сярэдняй мястэчковай шляхты. Таксама, як і навагрудскі "Корпус", "Войска" мела забаўляльны спартыўна-вайсковы характар. Вучні падзяліліся на два атрады: армію Напалеона і армію Расіі, паміж якімі адбываліся імправізаваныя бітвы. Члены арганізацыі бралі імёны "багатыроў старажытнасці" палякаў Баляслава Харобрага, Юзэфа Панятоўскага і інш. Найбольш актыўных у "бітвах" адзначалі ордэнамі ў выглядзе крыжа з надпісам па-польску "Святая Міласць Айчыны". Пад Айчынай мелася на ўвазе Рэч Паспалітая.

Разам з тым у дзейнасці арганізацыі ярка акрэсленым быў і культурна-асветніцкі накірунак. Гэта з'яўлялася яшчэ адной формай захавання польскага патрыятызму.

Пра накірунак у культурна-асветніцкай дзейнасці арганізацыі дае ўяўленне літаратурная дзейнасць аднаго з будучых заснавальнікаў таварыства філаматаў і філарэтаў Т.Зана, які ў 1813-1814 гг. вучыўся ў Маладзечанскай школе. Ён быў ініцыятарам пастановак розных сцэн, у якіх фігуравалі такія, напрыклад, словы: "мы ў няволі (расійскай — С.Т.), шчаслівы той, хто можа аддаць жыццё за Айчыну (Польшчу, Рэч Паспалітую — С.Т.). О, няшчасная наша, палякі, краіна". У сваіх прамовах Т.Зан заклікаў да дапамогі Напалеону, "калі пачнецца вайна". Яна, на яго думку, дапаможа ім збавіцца ад расійскага панавання. Гэты, а таксама шэраг іншых твораў, напісаных Т.Занам (у тым ліку і ў перыяд вучобы ў Маладзечне), даюць падставу сцвярджаць, што і ён, і члены "Войска Марса і Апалона" лічылі сябе палякамі і іх патрыятызм быў накіраваны на аднаўленне Рэчы Паспалітай.

У 1819-1820 гг. у Свіслацкай гімназіі (Гарадзенская губ.) існавалі тайныя вучнёўскія гурткі "Навуковы" і "Маральны", члены якіх — дробнапамесныя беларускія шляхцічы — таксама ставілі за мэту праз "узаемную асвету, патрыятычныя думкі ў польскім духу, успаміны пра слаўных дзеячаў былой Польшчы" захаваць адданасць агульнай радзіме — Рэчы Паспалітай. Так, члены гуртка "Навуковы" на сваіх пасяджэннях гаварылі аб Рэчы Паспалітай, якую падзялілі паміж сабой Расія, Аўстрыя і Прусія. Адзін з членаў гуртка, Д.Шлаеўскі, казаў, што "трэба спачуваць няшчасцям, якія здарыліся з польскай нацыяй і якія прывялі да яе заняпаду". Галоўную віну за падзелы члены арганізацыі ўскладалі на Расію. Пераняўшы польскую культуру і польскі лад жыцця, яны не бачылі розніцы паміж польскай і беларускай шляхтай, таксама лічылі сябе палякамі.

Выхаваннем патрыятызму на прыкладах жыцця і дзейнасці вядомых польскіх дзяржаўных дзеячаў і палкаводцаў займаліся і члены гуртка "Маральны". Так, у вершы, напісаным сакратаром арганізацыі I.Качальскім і прысвечаным Юзэфу Панятоўскаму, апошні ўслаўляецца як дзяржаўны дзеяч, які ў 1812 г. выступіў на баку Напалеона супраць Расіі і пад кіраўніцтвам якога польскі корпус атрымаў у гэты час шэраг перамог над расійцамі.

Канстытуцыя 3 траўня 1791 г., згодна якой "Рэч Паспалітая абодвух народаў" (Польшчы і ВКЛ) ператваралася ў "Рэч Паспалітую Польскую" (г.зн. ва унітарную дзяржаву), таксама была сродкам выхавання польскага патрыятызму ў вучняў беларускіх губерняў.

20-я гады XIX ст. былі гадамі, калі ў Расіі дэмакратычна настроенае афіцэрства і цывільныя асобы шукалі шляхі для ўсталявання больш дасканалай формы дзяржаўнага кіравання ў краіне. Крыху пазней яны аб'ядналіся ў тайныя таварыствы, якія ўвайшлі ў гісторыю як дзекабрысцкія.

Менавіта ў гэты час, пад уплывам актывізацыі грамадска-палітычнага руху ў Расіі, на Беларусі ажывае патрыятычны маладзёжны рух. Прыкладам таму з'яўляецца існаванне тайных вучнёўскіх арганізацый у Беластоцкай і Свіслацкай гімназіях, якія насілі агульную назву "Заране". Кіраўнік беластоцкіх "Заран" Ф.Ляховіч, які ў 1823 г. заснаваў тут гэта таварыства, так тлумачыў яго назву: "Святло зары з'яўляецца папярэднікам сонечных промняў. Мы з'яўляемся святлом зары, калі нават не будзе нам наканавана ўбачыць промні сонечныя, то людзі будуць ведаць аб нас, што мы існавалі і пракладвалі дарогу сонцу". Ф.Ляховіч даў зразумець, што вучні, якія ўвайшлі ў склад арганізацыі, будуць, у меру сваіх магчымасцяў, змагацца за аднаўленне сваёй краіны - Польшчы, пад якой ён разумеў Рэч Паспалітую. Вучні, "прынятыя ў таварыства, атрымлівалі асобныя "прозванія", якія даваліся па прозвішчах вядомых палякаў, каб успамінамі іх імён узбудзіць пачуцці патрыятызму ў членаў таварыства". "Заране" бралі сабе прозвішчы Баляслава Харобрага, Стэфана Баторыя, Юзэфа Панятоўскага і іншых. польскіх дзеячаў. За сувязь з культурна-палітычнай арганізацыяй дзекабрысцкага тыпу "Таварыствам ваенных сяброў" амаль усе "Заране" былі арыштаваныя.

Разбурэнне этнічнай самасвядомасці патэнцыяльных сіл беларускага нацыянальнага адраджэння прыхільнікамі польскасці хутка дапоўніцца не менш моцнай і жорсткай русіфікацыяй, якую распачне расійскі царызм. Беларусь апынецца паміж двух агнёў. А следам на сем з лішнім дзесяцігоддзяў накладзе свой адбітак на беларускае грамадства бальшавізм.

У выніку аказаліся моцна падарванымі універсальныя сімвалы самасвядомасці беларусаў, носьбіты іх духоўнасці — родная мова, аўтэнтычны фальклор, традыцыйны нацыянальны лад жыцця. Вось чаму, нягледзячы на ўсе намаганні нашай перадавой інтэлігенцыі, працэс адраджэння, як падкрэсліў народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч, "ідзе марудна, таму што адразу натыкнуўся на моцныя сілы процідзеяння, сілы, якія хацелі б павярнуць кола гісторыі назад. Яны апіраюцца на тое, што ёсць нашай вялікай беларускай бядой — на слабую нацыянальную самасвядомасць беларусаў".

Сяргей ТАЛЯРОНАК.
г.Менск.

“Калі я ёсць беларус...”

З вядомым беларускім мастаком Уладзімірам Вішнеўскім гутарыў наш пазаштатны карэспандэнт.

— Уладзімір Мікалаевіч, Вы прафесійны мастак, акадэмік Беларускай акадэміі выяўленчага мастацтва, загадчык кафедры графікі нашай акадэміі. Вашы поспехі ў станковай і кніжнай графіцы відавочныя. Цікава, як Вы, вясковы чалавек, прыйшлі ў мастацтва?

— У дзяцінстве я любіў маляваць. У нас на Случчыне былі самадзейныя мастакі, якія малявалі дываны, яны мяне вельмі ўражвалі. Маім бацькам, якія бачылі маё захапленне, неяк трапілася на вочы аб'ява, што ў Менску ёсць мастацкая школа-інтэрнат, і я туды паступіў. Тады там выкладалі маладыя, захопленыя сваёй справай настаўнікі — Свентахоўскія, Шчамялёў і іншыя, якія і прывілі мне любоў да мастацтва графікі. Таму я пасля мастацкай школы паступіў у тэатральна-мастацкі інстытут на кафедру графікі.

— А што на Вас больш за ўсё паўплывала як на творчую асобу?

— Нейкай пэўнай зоркі, якая вяла б мяне ў дзяцінстве, назваць не магу, акрамя як згаданых маляваных дыванoў. Магчыма, у пэўным сэнсе на мяне паўплывала тое, што ў нас, як толькі надыходзіла зіма, усе сядалі за кросны. У кожнай хаце стаяў станок, і жанчыны ткалі посцілкі, ручнікі, настольнікі. Жанчыны патаемна спаборнічалі паміж сабой — хто вытча лепшую, прыгажэйшую рэч. У мяне і мама ткала, і бабуля ткала. Яны стваралі асаблівы, казачны свет, і гэта не магло не ўплываць на маю душу. А яшчэ мама цудоўна вышывала, пляла карункі. Думаю, менавіта ад яе мне перайшло адчуванне прыгожага. Хаця ў мяне і прадзед быў цудоўным майстрам. Відаць, род наш быў такі. Вось нядаўна ў царкве я ўбачыў абраз, укрыжаванне, падпісаны Міхалам Вішнеўскім. Падумалася — можа, і ён нашага роду? Магчыма, але мне так і не ўдалося высветліць, ці мае ён якое дачыненне да нашай сям'і.

— Уладзімір Мікалаевіч, апошнім часам Вы актыўна і плённа займаецеся мастацкім афармленнем кніжак для дзяцей. Што Вас прывабіла да жанру кніжнай графікі?

— Мабыць, магчымасць увайсці ў свет дзяцінства, паўплываць на фармаванне дзіцячых густаў, на выхаванне дзяцей. А пачалося з таго, што пісьменнік Уладзімір Ягоўдзік даў мне пачытаць рукапіс сваёй кнігі “Янка і Ружа”. Твор мне вельмі спадабаўся, асабліва тое, як там увязана гісторыя Беларусі. Да таго ж, вельмі паэтычна ўплецена геаграфія. І мне захацелася кнігу праілюстраваць.

— А які ў Вас падыход да кніжнай ілюстрацыі, якая ў Вас канцэпцыя?

— У мяне такая пазіцыя — мастак не павінен проста ісці за радком. Я стараюся ісці паралельна з аўтарам, імкнуся ствараць паралельны свет. Ілюстрацыя падаецца ў кантэксце кнігі, і чытач па-свойму гэта ўспрымае, стварае свой вобраз.

— Чым Вас зацікавіла кніга для дзетак “Ці вернецца князь Кук?”

— Гэта зноў жа кніжка Уладзіміра Ягоўдзіка. Вельмі своеасаблівая. Яна ўяўляе сабой апісанне не арнітолага, а простага чалавека, які расказвае дзіцяці пра птушак. Аўтар паставіў задачу паказаць мастацкі вобраз не толькі жывёл ці птушак, а і асяроддзе. І ў той жа час каб гэта было натуральна.

— Якія кніжкі складаней ілюстраваць — для дзяцей ці для дарослых?

— Вядома, складаней працаваць для дзяцей. Тут існавала шмат тэндэнцый і плыняў. Многія кнігі зроблены пад спрошчаны дзіцячы малюнак. Цяпер мастакі, якія сур'ёзна працуюць у кніжнай ілюстрацыі, звяртаюць больш увагі на вобразны бок, уносячы свой унутраны свет у малюнак.

— Уладзімір Мікалаевіч, калі выбіраць, кнігу якога беларускага пісьменніка Вы хацелі б афарміць?

— У нас шмат таленавітых і любімых мной пісьменнікаў. Я люблю Дастаеўскага. Лічу, што ён беларус. Ён роду беларускага і мысленне ў яго беларускае. Люблю Караткевіча, хаця яго вельмі не проста афармляць. Мне вельмі падабаецца Багдановіч. З сучасных пісьменнікаў — Гілевіч, Разанаў, Мележ. “Людзі на балоце” апошняга — проста каласальны твор.

— Калі глядзіш на Вашы працы, то відаць, што гэта творы беларускага мастака. Як Вам удаецца ўвасабляць у сваіх творах беларускі менталітэт?

— Не ведаю. Калі я ёсць беларус, то і мастацтва маё павінна быць беларускім. Гэта, відаць, са мной народжанае. Спецыяльна для гэтага я нічога не раблю, усё адбываецца на нейкім генетычным узроўні.

Распытвала Вольга ПАЗНЯК, студэнтка БАМ.

Кола сям'і

Масару ІБУКА

Пасля трох ужо позна

(Працяг.)

Многія бацькі захацелі б выхаваць дзіця творчай асобай. Але баюся, што сучасная сістэма выхавання творчага пачатку з ранняга ўзросту недастаткова эфектыўная.

Што такое творчасць?

Цяжка даць дакладнае вызначэнне, але ў найпростым сэнсе — гэта вольны палёт уяўлення, гэта абвостраная інтуіцыя, якія могуць выліваецца ў вынаходніцтвы і адкрыцці. На гэтым вышэйшым узроўні творчасці інтэлект, эрудыцыя і ўяўленне злітыя ў адно. Не выклікае сумненняў той факт, што поспехі творчасці ідуць карэннямі ў суб'ектыўнае эмацыйнае ўспрыняцце і досвед ранняга дзяцінства. Іншымі словамі, дзіцячыя фантазіі, якія здаюцца дарослым такімі далёкімі ад рэальнага жыцця, на самой справе з'яўляюцца зародкамі творчасці.

Напрыклад, вы дасцё дзіцяці цацку, скажам, у выглядзе нейкай жывёлы. Дзіця можа ідэнтыфікаваць сябе з гэтай жывёлай, сачыніць пра яе цэлую гісторыю на падставе нейкага рэальнага вопыту ці казкі, якую яно чула. Ці, напрыклад, якая-небудзь карціна можа распаліць яго ўяўленне да такой ступені, на якую дарослыя проста не здольныя. Гавораць, Леанарда да Вінчы ў дзяцінстве бачыў вядзьмарак, якія лёталі пад столлю, і ўсялякіх пачвараў, што варушыліся сярод плямаў і трэшчын на столі.

Дарослы малюе чайнік, а дзіця бачыць у малюнку рыбу з разяўленым ротам. Дарослы можа ўпікнуць дзіця: “Не кажы глупстваў, гэта чайнік”. Такі адказ будзе памылкай, і ён раўназначны знішчэнню пупышкі, ужо гатовай расцвісці.

Развівайце ў дзіцяці інтуіцыю (шостае пачуццё)

Мы ведаем, што ў чалавека ёсць пяць пачуццяў: зрок, слых, адчуванне смаку, паху і дотыку. Але ў яго ёсць і шостае пачуццё — інтуіцыя. Дзякуючы шостаму пачуццю многія жанчыны, напрыклад, беспамылкова даведваюцца пра здраду мужа. Але калі казаць сур'ёзна, інтуіцыя — важная ўмова любога значнага дасягнення. Усе вялікія вынаходнікі пакладаліся на сваю інтуіцыю, нягледзячы на свае велізарныя веды і досвед. Інтуіцыя перакрывае ўсе пяць пачуццяў і, такім чынам, з'яўляецца самым старажытным і фундаментальным пачуццём. Інтуіцыю таксама называюць “жывёльным інстынктам”, які выходзіць за межы логікі і здаровага сэнсу.

Я ўжо казаў, што дзіця да трох гадоў вельмі блізкае да жывёлы, і меў на ўвазе, што яно яшчэ нездольнае лагічна мысліць і абапіраецца на свае інстынкты. Вельмі важна памятаць пра гэта і заахвочваць развіццё яго інстынктаў, і ўжо ва ўсялякім выпадку не прыгашваць іх, калі прывіваеце яму навыкі і спрабуеце ўздзейнічаць на яго логікай і доказамі розуму. Больш таго, паколькі інтуіцыя — гэта сукупнасць усіх пяці пачуццяў, развіццё інтуіцыі абвастрае і ўсе пачуцці.

Ці патрэбныя палавыя адрозненні ў выхаванні дзіцяці

Калі бацькі мараць, кім стане іх дзіця, яны ўлічваюць яго пол: “Ён будзе палітыкам ці вучоным!”, “Спадзяюся, яна будзе прыгажуняй і разумніцай!” Чаму ж мы па-рознаму адносімся да нованароджанага хлопчыка ці дзяўчынкі?

На самай справе да трох гадоў між паламі ў фізічным абліччы няма вялікай розніцы. Часам мы нават чыста знешне не можам іх адрозніць. У некаторых мовах маленькае дзіця і ўвогуле ўжываецца ў ніякім родзе. Навука таксама лічыць, што палавыя адрозненні пачынаюць праяўляцца пасля трох гадоў. Вядомы дзіцячы псіхолаг Ван Арнштэйн правёў серыю даследаванняў, з якіх зрабіў выснову, што толькі пасля трох гадоў паводзіны дзяцей пачынаюць адлюстроўваць палавую прыналежнасць, а ўжо ва ўзросце чатырох ці пяці гадоў дзеці выразна праяўляюць свой пол у гульнях. Такім чынам, да трох гадоў толькі форма палавых органаў указвае на адрозненне між паламі.

Нягледзячы на гэта, бацькі выхоўваюць дзіця з улікам яго полу. Напрыклад, нованароджанага хлопчыка апранаюць ва ўсё блакітнае, а дзяўчынку — у ружовае. Свайго густу ў малечы пакуль што няма. І што дрэннага ў тым, калі б хлопчык насіў ружовае адзенне, а дзяўчынка гуляла б з цацачным пісталетам? Ці трэба адбіраць у хлопчыка ляльку, калі ён праявіў да яе цікавасць? Нашто ўвесь час нагадваць яму, што ён хлопчык? І чаму дзяўчынка не можа зацікавіцца барацьбой?

Нямецкага паэта Рыльке выхоўвалі, як дзяўчынку, нават апраналі ў жаночае адзенне. Але ад гэтага ён не вырас падобным да жанчыны. Замест таго, каб турбавацца, як бы дзяўчынка не вырасла мужападобнай, а хлопчык — падобны да жанчыны, лепей было б бацькам усвядоміць, якую шкоду яны наносяць псіхіцы дзіцяці, калі навязваюць яму свае ўяўленні пра палавыя адрозненні.

(Працяг будзе.)

Як на дзіцячы розум...

***

Бабуля пытаецца ў Віталіка (4 гады): “Навошта ты, унучак, перакуліў вядро, у якое я сабрала каларадскіх жукоў?”

— Я падумаў, што яны табе непатрэбныя, бо ты паставіла вядро пасярод агарода.

***

Едуць у аўтобусе бабуля з унукам з пошты, дзе ім не выдалі пенсію (не хапіла грошай). Гледзячы на рэкламны плакат, на якім дзяўчына толькі ў блузцы, хлопчык кажа:
— Бабулечка, бачыш: ёй таксама не хапіла грошай на спадніцку, як мне на цукеркі.

БЫВАЛЫЯ ЛЮДЗІ

Да бабулі падыходзяць, узяўшыся за рукі, двое ўнукаў: яму 4 гады і ёй 2. Ён пытаецца:
— Што ты робіш?
Бабуля адказвае:
— Кармлю расліны борам.
На што ён кажа:
— Не чуў я, каб кармілі борам.
І яна ўслед прапела, бы ў оперным дуэце:
— Не цюла я, каб борай кармілі.

Запісала Л.СУДЗІЛОЎСКАЯ.

Таццяна ФАМІНА,
кандыдат медыцынскіх навук

Здароўе

Сардэчны вітамін

(Працяг.)

На падставе анкетаў часопіса “Prevention” (больш за 1,5 млн. падпісчыкаў) навукоўцы сцвердзілі, што лепшыя вынікі дало шматгадовае лячэнне такаферолам. Прыкладам, з ліку 80-89-гадовых людзей, каторыя прымалі вітамін Е цягам 20-29 гадоў, 85,6 працэнт. цалкам пазбавіліся сардэчных хваробаў. А сярод тых, хто лячыўся такаферолам менш года, добрых вынікаў дамагліся 71,8 працэнт. Значна лепш пачалі пачуваць сябе 90-99-гадовыя. Пасля шматгадовага спажывання вітаміну Е колькасць вылечаных сягала 100 працэнт. Пра добрыя вынікі лячэння паведамілі ў часопіс больш за 80 працэнт. 60-69-гадовых чытачоў.

Заўважана, што сярод 50-59-гадовых жанчын было шмат такіх, хто яшчэ не перажыў менапаўзы. Такім чынам, пацвердзілася меркаванне, што палавыя гармоны, асабліва эстрагены, выконваюць ахоўную функцыю. Таму і выпадкаў смерці жанчын з прычыны сардэчных хвароб прыблізна ў два разы менш, чым у мужчын таго ж веку.

Выяўленыя таямніцы

Старэнне эрытрацытаў — чырвоных цельцаў крыві — прысцешвае ўздзеянне святла і кіслароду. У выніку акіслення, якое аслабляе клетачную мембрану, эрытрацыты выглядаюць нібы вялымі, скурчанымі.

Лічылі, што мембрана — гэта толькі від апакавання клеткі. Ды выявілася, што яны надзвычай складаныя па сваёй структуры ды хімічным складзе ўтварэнні. Яны ізалююць клеткі адна ад другой, але, маючы селектыўную (выбарную) пранікнёнасць, ствараюць магчымасць транспартыроўкі розных ёнаў ды ўнутрыклетачнага рэчыва. Да таго ж у саміх мембранах назапашваюцца ферменты, што ўдзельнічаюць у працэсе ўзбуджэння і рэакцыі на яго, а таксама ферменты, якія ўдзельнічаюць у пераўтварэнні энергіі, прыкладам, пад час фотасінтэзу. Таму, вядома, змены ў мембраннай структуры адбіваюцца на любых працэсах унутры клеткі. Адсутнасць нейкага мембраннага кампанента або ягонае змяненне вядзе да захворвання. Нармальнае функцыяванне клеткі пачынаецца з нармальнай мембраны, бо толькі такая зможа працуючы ці затрымаць неабходнае або шкоднае рэчыва. Можна толькі ўявіць, колькі хваробаў з'яўляецца і залежыць ад стану клеткавых мембранаў.

Доктар Джэфры С.Блэнд з універсітэта ў горадзе Такома (штат Вашынгтон) вырашыў дазнацца, якая ж роля такаферолу ў працэсе насычэння кіслародам клетак, у прыватнасці эрытрацытаў. Ён даваў ахвотным штодня па 600 м.а. вітаміну Е цягам 10 дзён. І пасля даследаваў вынікі ўздзеяння кіслароду і святла на кроў. Яна заставалася практычна здаровай, толькі нязначная колькасць эрытрацытаў гінула, у той час як у безтакаферольных паддоследных яны гінулі цалкам. Доктар Блэнд вызначыў, што верагодна аптымальная доза вітаміну Е — 400-600 м.а. Дарэчы, у некаторых выпадках гэтая колькасць можа быць недастатковай.

Лячэнне такаферолам дае добрыя вынікі ў выпадках так званай перамежнай кульгавасці (перамежающейся хромоты), калі людзям, пераважна старым мужчынам, дакучае боль і сутаргі ў нагах пасля працяглай хадзьбы,— чалавек пачынае кульгаць. Такі стан — яшчэ не хвароба, але сігнал, што ў ножных артэрыях штосьці не тое дзеецца. Пераважна гэта першы сігнал зачаснага склерозу крывяных начыненняў. Першым стаў лячыць вітамінам Е такія станы доктар Шут. І вынікі былі вельмі добрымі. У некаторых іншых дактароў лячэнне не было ўдалым. Як пазней выявілася, яны давалі сваім пацыентам толькі прахрошчаную пшаніцу: пры падліках пераканаліся, што тыя спажывалі не больш за 150 м.а. такаферолу, а неабходна атрымліваць 400 м.а. Да таго ж, станоўчы вынік з'яўляецца пасля 3-4-х месяцаў лячэння.

Падобны эфект наглядаецца і ў выпадках начных сутаргаў ножных мышцаў, калі чалавек ад болю прачынаецца. Паляпшэнне адчуваецца ўжо пасля спажывання 300-400 м.а. такаферолу цягам тыдня.

Варта дадаць, што прахрошчаную пшаніцу і чыстым такаферол трэба спажываць за паўгадзіны — гадзіну перад ядой. І, як ужо згадвалася, неабходна сачыць, каб у ежы не было жалеза ці прэпаратаў з гэтым элементам, ачышчальных сродкаў ды лекаў ад хваробаў шчытападобнай залозы. Таксама і стравы з алеем вымагаюць павелічэння колькасці спажывання такаферолу.

(Закончанне будзе.)

Зялярскія гутаркі

Яблык

“Які яблык сакавіты, нібы мёдам ён наліты”. Ды хоць і не мёдам, а вадою (яе ў свежым амаль 83 адсоткі), усё ж і больш карысных рэчываў у яблыневым плодзе нямала: арганічныя кіслоты — яблычная, лімонная, вінная; цукар — глюкоза, фруктоза, цукроза; вітаміны А і В, карацін (правітамін А); дубільныя рэчывы — галавая кіслата, тэагалін, эфірны алей; “тлустыя” кіслоты — воцатная, прапіёнавая, ізамасляная, масляная ды іншыя. Маюць яблыкі вельмі вартасныя пекцінавыя рэчывы, солі кальцу, жалеза (увага! — тым, хто будзе лячыцца вітамінам Е), фосфару. Увогуле ў яблыках выяўлена 28 мікраэлементаў, у тым ліку медзь, манган, магнэз, кобальт.

Сакавітыя плады раяць спажываць усім — здаровым і хворым. Вялікая колькасць клятчаткі спрыяе нармальнай перыстальтыцы кішэчніка: трэба есці нашча сырыя або печаныя яблыкі. Варта згадаць, што яблычная кіслата стымулюе ўтварэнне АТФ (адэназінтрыфосфарная кіслата) — рэчыва, якое з'яўляецца адной з крыніц энергіі для мышцаў. Яблычны сок раяць піць ад хваробаў мочавага пухіра, нырак, печані, атэраслерозу, хранічных поліартрытаў, бранхітаў. Ды лепш згадаць словы амерыканскага доктара Франкліна, які сказаў, што калі чалавек будзе есці адзін яблык штодня, то яму не патрэбны будзе доктар.

Зяляр.



Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!

Францішак Багушэвіч.

Вучымся

Вікторыя ЛЯШУК,
кандыдат філалагічных навук

Практычная стылістыка

Зёлкін і зелле

"Зёлкін — гэта дрэннае зелле, ад якога няма рады простым людзям, спакойнаму жыццю і стараннай працы. Яно дзейнічае адпаведна свайму прызначэнню: дапамагае развіццю хворы, лепшы памочнік бяды, яе чароўная палачка". Характарыстыку адмоўнага -персанажа з камедыі К.Крапівы "Хто смяецца апошнім" абітурыент заснаваў на асацыятыўным суаднясенні яго прозвішча з канкрэтнай рэаліяй рэчаіснасці (зелле), маючы намер раскрыць сутнасць асобы праз разгорнутае параўнанне, вобразнае апісанне. Аднак выкарыстаныя стылістычныя не адпаведныя сродкі робяць выказванне квяцістым. Імкненне да арыгінальнасціператварылася ў слоўную непатрабавальнасць ды арыгінальнічанне. Колькасць і яркасць параўнанняў стала самамэтай, вызначыла супярэчную ацэначнасць.

Успрыняцце зместу ўскладняецца прыкрымі граматычнымі ды лексіка-фразеалагічнымі памылкамі. Звернемся да слова **хворы**. У беларускай мове гэта форма адпавядае прыметніку, мае іншую спалучальнасць: **хворы чалавек, хворы арганізм, хворы голас, хворы выгляд**. Ужыта ж яно ў функцыі назоўніка пад уплывам расійскага слова *хворь*, беларускімі адпаведнікамі якога з'яўляюцца словы **хвароба, хворасць, немач**.

Цяпер скіруем увагу на фразеалагізм **няма рады**. ТСБМ так тлумачыць яго: 'не хапае сілы, магчымасці справіцца з кім-небудзь, чымнебудзь'. Значыць, з трох спалучаных з гэтым выслоўем лексем (няма рады людзям, жыццю і працы) толькі адна ўжыта правільна — адушаўлёны назоўнік **людзі**.

Прааналізуем стылёвыя хібы. Папершае, для апісання адмоўных рыс варта выбіраць словы з адмоўнай ацэначнасцю, інакш утвараецца стылёвая стракатасць і нематываваная кантраснасць.

У прыведзеным кантэксце на станоўчых якасці ўказваюць словазлучэнні **лепшы памочнік, чароўная палачка**. Няўдалай уяўляецца і перыфраза **памочнік бяды**. Больш выразна передае адмоўную сутнасць стылістычна афарбаваны назоўнік **памагаты**.

Па-другое, у словазлучэнні **дрэннае зелле** якасны прыметнік з'яўляецца занадта абагульненай ды неарыгінальнай характарыстыкай. Канкрэтызаваць, ажывіць вобраз дапамогуць яркія, трапныя азначэнні **шкоднае** (зелле), **атрутнае** (зелле). Можна выкарыстаць і складаны назоўнік **пустазелле**, які таксама ўказвае на сутнасць Зёлкіна.

Такім чынам, улічваючы заўвагі можна прапанаваць нешматслоўныя, аднак змястоўныя выказванні.

Зёлкін — гэта шкоднае зелле (пустазелле), што заглушае карысныя парасткі. Ён паўсюль сее падазронасць, варожасць і недавер. Зёлкін — гэта атрутнае зелле, што забівае ў людзях веру ў справядлівасць і высакароднасць...

Прывядзём найбольш удалыя варыянты выпраўлення, прапанаваныя на практычных занятках па стылістыцы студэнтамі-філолагамі:

Зёлкін — сапраўдная атрута для сэрцаў людзей, якая непазбежна разбурае нармальнае чалавечае жыццё, перашкаджае добрасумленна працаваць. Ад такіх "дзеячаў", як сумнавядомы персанаж камедыі К.Крапівы, усе хваробы і беды нашага грамадства.

Зёлкін — невук, пляткар і прыстасаванец. Як тое шкоднае зелле, якое выцягвае ўсе сокі расліны, існуе за кошт іх, ён жыве думкамі, меркаваннямі іншых людзей. Ён у нейкай ступені добры псіхолаг: ведае, у які момант сказаць і што сказаць, і, канечне, не без уласнай выгоды. І тут выкарыстоўваюцца любыя сродкі: плётка, шантаж, ліслівае ўсхваленне.

Зёлкін, сапраўды, тое шкоднае зелле, якое дапамагае развіццю хваробы і можа атруціць людзей, што знаходзяцца побач.

...Столькі ж шкоды, колькі пустазелле прыносіць культурным раслінам, Зёлкін робіць людзям.

Зёлкін — гэта паганы чалавек, ад якога няма ніякай рады і спакою простым людзям. Ён атручвае жыццё ўсім, хто старанна працуе. І здаецца, што асноўнае яго прызначэнне — прыносіць гора і беды.

Валянціна ВЫХОТА,
кандыдат педагагічных навук

Ствараем энцыклапедыю "Новай зямлі"

Коласавы зернеткі

Характарызуючы здольнасці дзядзькі Антося, Якуб Колас ужывае і словы **штука, штукар, штукаваць**.

*Купіць касу — о, гэта **штука**!*
Яшчэ больш важная навука —
Умець дагнаць касу да ладу.

У паэме паказана, як дзядзька выбірае касу, і паэт падводзіць да абагульнення значэння слова *штука* (*Купіць касу — о, гэта штука!*), дадзенага ў ТСБМ: **штука** 3. разм. // Пра тое, што мае істотнае значэнне, асаблівасць. Тут можна прывесці паралель: besondere 1. особенный; das ist etwas ganz Besonderes это что-то особенное / необыкновенное (DRLW).

Мы бачым, як дзядзька ўмела выбірае касу і ў выразе: **Купіць касу — о, гэта штука!** Якуб Колас паказвае вяршыню ўмельства дзядзькі Антося ў гэтай справе. Ён майстра выбраць добрую касу. Параўнайце: er versteht seine Sache Он знает своё дело (DRS), а таксама ich verstehe mich nicht auf die Reparatur von Schreibmaschinen (WW)

Антось наш дбалы, акуратны,
А пры рабоце які здатны!
Што ні замысліць, то ўсё
зробіць,
І так прыгоніць, так аздобіць,
Што і для вока нават міла.
І ўсё выразна гаварыла,
Што ён не толькі гаспадар,
*Але й прыроджаны **штукар**.*

Штукар 2. Той, хто вырабляе розныя складаныя мудрагелістыя рэчы: майстар, вынаходца (ТСБМ).

Тое, што дзядзька "ўсё зробіць" і "так аздобіць", што "і для вока міла", азначае: чалавек адчувае эстэтычную асалоду, калі глядзіць на зробленую дзядзькам рэч. І ў словы "прыроджаны штукар" укладаецца адценне сэнсу слова *штукар* — талент мастака.

Мастак, 1. (работник искусства) художник (БРС); художник 1. Künstler m (РНС); прирождённый 2. (настоящий) geboren, echt (РНС); echte Kunst, ein echter Künstler настоящее искусство, настоящий артист (DRS)

Künstler m художник; артист (GDRW). Словазлучэнне ein echter Künstler адпавядае радку ў паэме Якуба Коласа "Але й прыроджаны штукар".

І дзядзька майстар быў на
штукі,
І быў механік на ўсе рукі:
І дудку скруціць вам, і стрэлку,
І нарысуе, нават, елку,—
*Такую **выштукае** цацку.*

Штукаваць, 3. перан. Выдумляць, майстраваць, вынаходзіць што-н. (ТСБМ); **штукаваць** 3. перан. разг. выдумывать, изобретать (БРС); мастерить basteln (РНС); basteln allerlei kleine Arbeiten, die **geschickte** Finger erfordern, selbst herstellen: seinem Kind ein Spielzeug basteln (WDG).

У гэтым кантэксце падразумяваецца, што дзядзька быў майстар на выдумкі — штукі; выдумка 1. Erfindung f 1. в разн. знач. изобретение (GDRW).

Герман Паўль падае, што слова erfinden абмежавалася двума значэннямі: 1. вынайсці тое, што да гэтага часу не было вядома: eine Maschine, ein Arzneimittel erfinden; 2. процілеглае таму нечаму, што ёсць у сапраўднасці: eine Geschichte, einen Vorwand erfinden (DW).

Штука. Ням. Stück n. с.-в.-ням. stücke, ст.-в.-ням. stucki, ст.-сакс. stukki узыходзіць да слова Stock m 'кій',грэц. stylos 'кій 'яно як слова Stück, мела першапачатковае значэнне "адсечанае". Спачатку азначала "аддзеленая частка ад нечага цэлага" (параўн. in Stücke zerbrechen (DW)). Той жа корань, што і ў слове *стаць* — і.-е. корань *stu-, *stā- 'стаяць'.

Беларускае адраджэнне

Алена ЯСКЕВІЧ,
кандыдат філалагічных навук

Знакамітая паэма Івана Ужэвіча

З кракаўскага перыяду дайшлі да нас толькі паэтычныя творы Івана Ужэвіча пераважна панегірычнага жанру. Так, у працы В.Мацяёўскага "Стан польскага пісьменства ад часоў старажытных да 1830 года" ўпамінаецца пра даволі значны па памеры панегірычны твор-прысвячэнне І.Ужэвіча на шлюб Аляксандра Пржылецкага з Евай Рупнеўскай (1641 г.)

Паэма І.Ужэвіча "Вобраз цноты..." была арганічнай для лаціна- і польскамоўнай літаратуры Кароны і Княства, у якой перамаглі матывы апісання жыцця і побыту шляхты, яе вузкапрывытных праблем. Жанр ідыліі, удала ўведзены ў літаратуру Янам Каханоўскім і плённа развіты Сымонам Сымановічам, узбагачаўся традыцыямі т.зв. "савізжальскай" (сатырычна-жартаўлівай) літаратуры. Занапад славянскіх зямель, палітычная анархія, эканамічны крызіс Рэчы Паспалітай стварылі ненатуральныя ўмовы для высокіх ідэй. Захапленне ўласнай высакароднасцю і раскошным аздабленнем, любоўнымі і палітычнымі інтрыгамі, шматлікімі мясцовымі войнамі абумовіла з'яўленне ў асяродку пісьменнікаў твораў панегірычных, прысвечаных радаводам і прыватным урачыстасцям знакамітых магнацкіх і шляхецкіх сем'яў.

Кракаўская паэма 1641 года Івана Ужэвіча "Вобраз цноты..." таксама адчувае на сабе ўплыў лепшых традыцый сярэднявековай французскай паэмы: "Аб уласцівасцях траў" Одо з Менана-Лауры (надзвычай папулярнай у прыхільнікаў прыгожага пісьменства і вучоных у эпоху Адраджэння), сатырычнага жывёльнага эпасу ("Раман аб Лісе"), алегарычнага маралітэ ("Раман аб Розе"), куртуазных аповесцяў ("Акасэн і Мікалет").

Вытанчаны мастакоўскі густ І.Ужэвіча, філіграннае майстэрства радка, глыбіннае пачуццё рытму і гармоніі гавораць пра знаёмства нашага земляка з лепшымі творамі сучаснай яму французскай літаратуры, прыхільнікаў класіцызму Франсуа Малерба і Мікалая Буало, прадстаўнікоў як "высокага", "прэцыёзнага" барока Венсана Вуацюра, Анарэ д'Юрфэ, так і барока побытава-рамантычнага — Тэафіля дэ Віе, навукова-фантастычнага — Сірано дэ Бержэрака.

Асаблівую цікавасць, на думку даследнікаў, уяўляе эпілог панегірыка, дзе Іван Ужэвіч "апісаў асобу Заіла, яго жыллё і харчаванне, у канцы іранічна вызначыў яго долю, трапна абараніўшы сябе ад магчымай крытыкі на будучае".*) Зварот да Заіла гучыць, як рэтраспектыўная абарона Гамера і паэзіі ўвогуле.

Другі свой твор, васьміpадковы верш з фамільным гербам у гонар паноў Пшылецкіх, аўтар пазней паўторна змясціць у арасскім рукапісе сваёй "Граматыкі".

Відаць, універсітэцкі дыплом тады абавязваў да валодання версіфікацыяй. Не выпадкова старажытныя граматыкі мелі спецыяльныя раздзелы рыторыкі і прасоды, рэшткі якіх мы знаходзім у "Граматыцы" Лаўрэнція Зізанія. Але так ці інакш, у І.Ужэвіча выявіліся паэтычныя здольнасці і, мяркуючы па яго пазнейшых "эпіграмах" да парыжскага і араскага рукапісаў яго "Граматыкі", паэзіі ён не здраджвае і ў далейшым.

*) *Граматика слов'янська І.Ужевіча. Київ, 1970. С. XIII.*

З гісторыі красамоўства на Беларусі

Месца ў Полацку

І навіна, і даўніна адна ў нас.
Дзмітрый Кавалёў.

23 лютага 1406 года канцылярыя князя Вітаўта склала два тэксты дарчай, юрыдычна аформіла права рыжанаў на валоданне зямлёй у Полацку для пабудовы царквы. Напісаныя на нямецкай ды старажытнабеларускай мовах дакументы пазначаны княжэвай пячаткай, маюць аднолькавы законны статус. Нямецкамоўны варыянт быў накіраваны ў рыжскі магістрат, другі прызначаўся і быў перададзены рыжанам, прысутным у Полацку: ***Се язь великий князь Витовть дали есмо сю нашю грамоту рижаном, што ж дано было имъ мъсто оу Полоцку церковь ставить и отмерено, кдъ церков поставить, што ж бы никто не вступался в то мъсто, кдъ имъ церковь ставить.***

А писан оу Вилни во въторник на Федорове недели. Грамата вызначаецца сціпласцю, строгасцю і змястоўнасцю, мае форму загаду.

У нямецкім тэксце значна больш слоўнай дэталізацыі: у найменні князя, пры апісанні надзела, у вызначэнні правоў рыжан. Таму кожны з адпаведных артыкулаў больш аб'ёмны, змяшчае розныя мадэлі ўдакладнення. Напрыклад, у пачатку граматы прыведзены два імені князя, ужыта ацэначная формула сцвярджэння ўладнай правамоцы, што ў перакладзе гучыць наступным чынам: "Мы, Аляксандр інакш Вітаўт, божай літасцю вялікі князь Літвы" і г.д.

У традыцыях афіцыйнага стандарту названы — абагульнена, урачыста, узнёслым стылем — юрыдычны суб'ект дарчай, прычыны і мэты яе ўзнікнення. Юрыдычная значнасць дакумента падкрэслена формай звароту да шырокага кола асоб, сцвярджэннем нязменнасці княжай волі праз прыметнік **вечны**: "...даём ведаць усім тым, хто пачуе гэту грамату, што дзеля славы Бога і памнажэння хрысціянскай веры далі ды гэтай граматай пацвердзілі на вечныя часы зямлю... у Полацку такой шырыні ды такой велічыні, як па нашаму загаду паказаў наш маршалак Чупурна сам сваёй уласнай рукою, усяму нямецкаму купецтву і гандлярам, каб яны маглі на ёй пабудаваць каменную ці драўляную хрысціянскую царкву і трымаць пры ёй хрысціянскага святара — як ім будзе заўгодна.

І ні мы, ні нашы нашчадкі ў вечныя часы не павінны парушаць".

У размеркавальнай злучнікавай канструкцыі перадаецца магчымасць выбару (каменная ці драўляная царква). Удакладненне **як ім будзе заўгодна** падкрэслівае дастаткова шырокую свабоду дзеяння замежных грамадзян, адсутнасць дыктату, павагу да асобы. Праз стыль дакумента выразна вылучаюцца этычныя і палітычныя прынцыпы беларускай дыпламатыі.

Супастаўленне разнамоўных варыянтаў дарчай сведчыць пра адметнасць дыпламатычнага стылю выказвання ў канцылярыях Вітаўта, пра ўменне гнутка карыстацца мовай, выбіраць сродкі паводле зместавай адпаведнасці, веданне стылёвых магчымасцяў, моўных традыцый сваёй ды іншых краін.

Мова, стыль — гэта наша даўніна, гэта наша навіна. Пра гэта сведчаць захаваныя ў Рызе гэтыя дзве і шмат іншых беларускіх старажытных грамат.

Культура мовы

Алесь КАЎРУС

Вымагае сістэма

Здаецца, аціхлі спрэчкі, што нядаўна былі ўсчаліся, як толькі стала выходзіць у літаратурны ўжытак слова *выстава*.

Цяпер усе ўбачылі: нічога страшнага не здарылася. Засталося ў мове і слова *выстаўка*, хапае месца і варыянту *выстава*. Яны мірна суіснуюць на старонках беларускіх выданняў, у вуснай мове. Якое з гэтых слоў ужыць, кожны выбірае на свой густ.

Спрадвеку ў мове такая заканамернасць: існуе назоўнік — ад яго павінен зазвычай быць і прыметнік. Ну, як у гэтай роднаснай пары: *выстаўка — выставачны*.

Ці ёсць, а калі няма, то які мае быць прыметнік на аснове назоўніка *выстава*?

Моўная практыка пакуль не вызначылася з такім прыметнікам. Пішуць: *выстава*, а прыметнік ужываюць традыцыйны — *выставачны*. Праўда, на пісьме не пазначаецца націск, таму невядома, на якім складзе яго ставіць (вымаўляе) той ці іншы аўтар.

Большую пэўнасць для вывадаў дае вуснае маўленне. Давялося пачуць: "Адзін мэтар **выста́вачнай** плошчы каштуе да двухсот нямецкіх марак... Разьвіцьцё **выста́вачна**-кірмашовай дзейнасьці..." (Радыё "Свабода", 9.03.95).

Так прамаўляла слова *выставачны* і супрацоўніца музея з Полацка ў гутарцы з карэспандэнтам: "Мы ствapылі выставы... У **выста́вачных** залах размясцілі..." (Беларускае радыё, 30.05.96).

З прыкладаў відаць, што размоўцы імкнуцца асэнсаваць (і ўжываць) "стары" прыметнік як утвораны ад назоўніка *выстава*, змяніўшы дзеля гэтага месца націску — *выста́вачны*.

Але у сапраўднасці ад назоўніка *выста́ва* ўтварыўся прыметнік *выстаўны́*. Беларускае радыё аднойчы (26.12.94) перадало рэкламу-запрашэнне фірмы "Дайнова": "Заходзьце ў новую **выстаўну́ю** залу". Слова *выстаўны*, з націскам на першым складзе, было ўжыта ў перадачы радыё "Свабода" (23.05.96): "Цэнтральнае месца на **вы́стаўнай** пляцоўцы займала машына". (Хоцькіняхоцькі, а трэба карыстацца прыкладамі з передач замежнага радыё, бо наша айчыннае на беларускай мове рэкламы амаль не дае).

Можна дапусціць, што дыктар, чытаючы тэкст, незнарок, памылкова зрушыў акцэнт на слове. Ды як бы там ні было, прыметнік *выстаўны* (з націскам на другім складзе) яскрава выяўляе словаўтваральную сувязь з назоўнікам *выстава*. Гэта натуральнае, адпаведнае законам беларускай мовы ўтварэнне.

Такім чынам, ёсць падставы ўжываць як традыцыйныя *выстаўка — выставачны*, так і адносна новыя ў беларускай літаратурнай мове словы *выстава — выстаўны* (*выста́вачны*).

Праграма тэлебачання

Панядзелак, 28 кастрычніка

Беларускае тэлебачанне

7.30 Ранішні кактэйль.
7.50, 18.35 Эканамікст.
8.00 Сядзіба.
8.25 Мультфільмы.
9.10 "Блукаючыя агеньчыкі". М.ф., 1-я ч.
10.15, 18.05 Фінансавы час.
10.35 Музычны салон Элеаноры Язерскай.
11.10 "Крыж міласэрнасці". М.ф., 1-я і 2-я ч.
13.45 Люстэрка.
14.05 Фільм-канцэрт.
15.00, 18.50, 23.50 Навіны.
15.10 Мультфільм.
15.20 Тэлебачанне — школе. Пазакласнае чытанне. 4-ы клас.
15.40 Студыя "Акно".
16.35 На добры лад.
16.55 Параграф. Працаўладкаванне беспрацоўных па-за межамі Беларусі.
17.20 "Гэта мы не праходзілі..."
17.35 "Крок". "Рызыка-версія". Тэлегульня.
19.00 Да 75-годдзя Белдзяржуніверсітэта.
19.45 Музыка без межаў.
20.15 Тэлечасопіс моды.
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.50 "Нашы суседзі". М.ф.
23.10 Фільм-канцэрт.

ГРТ

14.00, 17.00, 22.25 Навіны.
14.20 Мультсерыял.
14.45 Марафон-15.
15.00 Зорны час.
15.40 "Элен і хлопцы".
16.05 Джэм.
16.30 Па старонках перадачы "Клуб падарожнікаў".
17.20 "Новая ахвяра".
18.10 Час пік.
18.35 Агадай мелодыю.
19.00 "Калі..."
19.45 Добрай ночы, малышы!
20.00 Час.
20.40 "Багз-2". М.ф.
21.45 "Сярэбраны шар".
22.35 "Мулен Руж", "Гісторыя Цюрына". М.ф.
23.40 "Пятніца, 13".

"Расія"

6.00 Ранішні экспрэс.
6.25 На дарозе на працу.
6.35 "Мак і Матлі".
7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 23.00 Вестці.
7.20 Ранішні экспрэс-2.
7.50 Прыёмная доктара Багданава.
8.00 Рэтра-шлягер.
8.25 "Дарагая рэдакцыя..."
8.55, 19.30 "Санта-Барбара".
9.50, 23.25 Тавары — поштай.
10.20 "Бакенбарды". М.ф.
16.20 Блак-нот.
16.35 Гульня ўсур'ёз.
17.05 Ваш партнёр.
17.15 L-клуб.
18.00 Момант ісціны.
18.40 Асабліва важныя персоны.
20.30 Джэнтльмен-шоў.
21.05 "На вастры нажа". М.ф.
22.00 Тэлескоп.
22.30 Халадноваты свет.
23.35 Музыка ўсіх пакаленняў.
23.50 "Не спі і глядзі".

Санкт-Пецярбург

17.05 Сядзібы.
18.40 Вялікі фестываль.
18.55, 22.55 Інфарм ТБ.
19.15 Спорт.
19.20 "Першае каханне".
20.10 Рытмы горада.
20.40 Тэлеслужба бяспекі.
20.55 Спартыўны агляд.
21.05 "Дэмпсі і Мейкпіс".
21.55 Падзея.
22.15 Гістарычныя расследаванні.

НТБ

17.00 "Дзеці супраць монстраў". 4-я ч.
17.30 Футбольны клуб.
18.00, 21.00, 23.00 Сёння.
18.35 Герой дня.
19.00 "Шэрлак — сабака-дэтэктыў". М.ф.
20.25 "Канюшня Роста".
21.35 "Тайныя злачынствы". М.ф., 3-я ч.
22.30 Часінка.
23.20 Тэніс у поўнач.

Аўторак, 29 кастрычніка

Беларускае тэлебачанне

7.30 Ранішні кактэйль.
7.50, 18.35 Эканамікст.
8.00, 15.00, 18.50, 0.15 Навіны.
8.15 "Гэта мы не праходзілі..."
8.30 Абібок.
9.00 Тэлебачанне — школе. Пазакласнае чытанне. 4-ы клас.
9.20 "Блукаючыя агеньчыкі". М.ф., 2-я ч.
10.25 Тураб'ектыў.
10.55, 19.35 "Трапічная спёка". 4-я ч.
11.55 Акалада.
12.25 "Крыж міласэрнасці". М.ф., 3-я і 4-я ч.
15.10 Мультфільмы.
15.45 Тэлебачанне — школе. Беларуская літаратура. 7-ы клас.
16.20 "Усё пра ўсё".
16.45 Беларускі мерыдыян.
17.15 Урокі Н.Наважылавай.
17.45 "Вострыя вугал".
18.15 "Будзьце здаровы".
19.00 Рэферэндум: шчырая размова.
19.35 "Трапічная спёка". 1-я ч.
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
22.15 "Першая сустрэча, апошняя сустрэча" М.ф.
23.45 Супергол.

ГРТ

11.00, 14.00, 17.00 Навіны.
11.10 Тэлерадыёкампанія "Мір".
11.55 "Расійскі транзіт" М.ф., 3-я ч.
12.55 Мультфільм.
13.15 Брэйн рынг.
14.20 Мультсерыял.
14.45 Кварʼэтэ "Вясёлая кампанія".
14.55 Мультытролія.
15.10 Чароўны свет, або Сінема.
15.40 "Элен і хлопцы".
16.05 ...Да шаснаццаці і старэй.
16.30 Па старонках перадачы "Клуб падарожнікаў".
17.20 "Новая ахвяра".
18.10 Час пік.
18.35 Агадай мелодыю.
19.00 Тэма.
19.45 Добрай ночы, малышы!
20.00 Час.
20.40 "Халоднае лета пяцьдзесят трэцяга..." М.ф.
22.35 Хакей. Еўраліга.
0.05 "Пятніца, 13". М.ф.

"Расія"

6.00 Ранішні экспрэс.
6.25 На дарозе на працу.
6.35 "Мак і Матлі".
7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 23.00 Вестці.
7.20 Ранішні экспрэс-2.
7.50 Экспавеснік.
8.00 Рэтра-шлягер.
8.25 "Дарагая рэдакцыя..."
8.55, 19.30 "Санта-Барбара".
9.50, 23.25 Тавары — поштай.
16.20 Блак-нот.
16.35 "Чэленджэрс".
17.05 "Здароўе".
17.15 Тры стагоддзі — тры гісторыі.
17.45 Надзвычайны канал.
18.15 Лідар-прагноз.
18.40 Асабліва важныя персоны.
20.30 Раз на тыдзень.
21.05 Мужчына і жанчына.
21.45 Ціхі дом.
22.25 Начное жыццё гарадоў свету.
23.35 Музыка ўсіх пакаленняў.
23.50 "Хто на што здатны".
0.05 Гарачая дзесятка.

Санкт-Пецярбург

11.55, 14.00, 15.55, 18.55, 23.25 Інфарм ТБ.
12.10, 19.20 "Партрэт жанчыны". 1-я ч.
13.00 Тэрмін адказу — сёння.
13.45, 20.45 Тэлеслужба бяспекі.
14.10, 21.10 "Дэмпсі і Мейкпіс".
15.00 "Адысея Аляксандра Вярцінскага". Ф. 1-ы.
16.10 Тата, мама і я — спартыўная сям'я.
16.40 "Інспектар Гэджэт".
17.05 Дзіцячае ТБ. Дзецям пра звяранят.
18.40 Вялікі фестываль.
19.15 Спорт.
20.20 Формула згоды.
21.00 Спартыўны агляд.
22.00 Падзея.
22.15 "Раман імператара". М.ф., 1-я ч.

НТБ

17.00 "Дзеці супраць монстраў". 5-я ч.
17.30 "Вуліца Сезам".
18.00, 21.00, 23.00 Сёння.
18.35 Герой дня.
19.00 Футбол. Кубак УЕФА.
21.35 "Тайныя злачынствы". М.ф., 4-я ч.
22.30 Часінка.
23.20 Чэмпіянат Расіі па шахматах.
23.50 Меламанія: "Энгельберт Хампердзінк".

Серада, 30 кастрычніка

Беларускае тэлебачанне

7.30 Ранішні кактэйль.
7.50, 18.35 Эканамікст.
8.00, 15.00, 18.50, 23.50 Навіны.
8.15 "Хай б'юць мяне — дужэйшы буду". Д.ф.
9.00 Тэлебачанне — школе. Беларуская літаратура. 7-ы клас.
9.35 "Тайна Снежнай каралевы". М.ф., 1-я ч.
10.45 Мультфільмы.
11.10 "Трапічная спёка".
12.10 Відзьма-навідзьма.
13.10 "Спрытнюгі". М.ф.
14.30 "Ане Вескі". Фільм-канцэрт.
15.10 "Комік Маскоўскага цырка Карандаш".
16.20 "Калейдаскоп сустрэч".
17.05 Крэда. Новыя формы эканамічных адносін на Беларусі.
17.25 "Творчая сустрэча".
17.55 Госці ў хату.
19.00 Баскетбол. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны.
20.30 "Хто гэта?" Тэлегульня.
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.55 Аўта-парк.
22.15 "Прэферанс па пятніцах". М.ф.
0.05 Каралеўскае паляванне.

ГРТ

11.00, 14.00, 17.00, 23.20 Навіны.
11.10 Тэлерадыёкампанія "Мір".
11.55 "Расійскі транзіт" М.ф., 4-я ч.
12.50 Мультфільмы.
13.15 Брэйн рынг.
14.20 Мультсерыял.
14.45 Кактус і К.
14.55 До-мі-соль.
15.15 Кліч джунгляў.
15.40 "Элен і хлопцы".
16.05 Тэт-а-тэт.
16.30 Па старонках перадачы "Клуб падарожнікаў".
17.20 "Новая ахвяра".
18.10 Час пік.
18.35 Агадай мелодыю.
19.00 "Каб помнілі..." Л.Целікоўская.
19.45 Добрай ночы, малышы!
20.00 Час.
20.40 КВЗ-асарці.
21.15, 23.30 Футбол. Ліга чэмпіёнаў.

"Расія"

6.00 Ранішні экспрэс.
6.25 На дарозе на працу.
6.35 "Мак і Матлі".
7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 23.00 Вестці.
7.20 Ранішні экспрэс-2.
7.50 У свеце капіталу.
8.00 Рэтра-шлягер.
8.25 "Дарагая рэдакцыя..."
8.55, 19.30 "Санта-Барбара".
9.50, 23.25 Тавары — поштай.
10.20 "Небяспечны паварот". М.ф., 1-я ч.
16.20 Блак-нот.
16.35 "Чэленджэрс".
17.05 "Здароўе".
17.15 Даміно Міхаіла Баярскага.
17.45 Суайчыннікі.
18.10 Клуб губернатараў.
18.40 Асабліва важныя персоны.
20.30 "Гарадок".
21.10 "Адтэрміноўка прыгавору". М.ф.
23.35 Музыка ўсіх пакаленняў.
23.50 "Хто на што здатны".
0.05 "Не спі і глядзі".

Санкт-Пецярбург

11.55, 13.55, 16.00, 18.55, 23.05 Інфарм ТБ.
12.10, 19.20 "Партрэт жанчыны". 2-я ч.
13.00 Тэрмін адказу — сёння.
13.40, 20.35 Тэлеслужба бяспекі.
14.10, 21.05 "Дэмпсі і Мейкпіс".
15.00 "Адысея Аляксандра Вярцінскага". Ф. 2-гі.
16.15 "Асабістая справа". У.Жырыноўскі.
16.40 "Інспектар Гэджэт".
17.05 Храм.
18.40 Вялікі фестываль.
19.15 Спорт.
20.10 "Дварцовыя тайны". 1-я ч. "Забойцы".
20.50 Спартыўны агляд.
21.55 Падзея.
22.10 "Раман імператара". М.ф., 2-я ч.

НТБ

17.00 "Дзеці супраць монстраў". 6-я ч.
17.30 "Вуліца Сезам".
18.00, 21.00, 23.00 Сёння.
18.35 Герой дня.
19.00 "Тата-прывід". М.ф.
20.35 Група "Калібры".
21.35 "Тайныя злачынствы". М.ф., 5-я ч.
22.30 Часінка.
23.20 Чэмпіянат свету па рафтынгу.
23.50 Кафэ "Абломаў".

Чацвер, 31 кастрычніка

Беларускае тэлебачанне

7.30 Ранішні кактэйль.
7.50, 18.40 Эканамікст.
8.00, 15.00, 18.50, 24.00 Навіны.
8.15 Аўта-парк.
8.30 "Вяскоўцы".
9.00 "Развітальнае". Д.ф.
9.30 Каралеўскае паляванне.
10.10 "Тайна Снежнай каралевы". М.ф., 2-я ч.
11.20 "Востраў натхнення". Тэлеспектакль.
11.50 Госці ў хату.
12.20 Фільм-канцэрт.
12.50 "Не будзіце спячага сабаку". М.ф., 1-я і 2-я ч.
15.10 "Капітан Фракас". М.ф., 1-я ч.
16.25 Мультфільм.
16.35 "Сугучнасць".
17.05 Музычна-забаўляльная праграма для вайскоўцаў.
17.35 Урокі Н.Наважылавай.
18.05 Творцы.
19.00 Рэферэндум: шчырая размова.
19.35 "Трапічная спёка". 6-я ч.
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
22.15 "Мой ласкавы і пяшчотны звер". М.ф.
0.15 "Крок". "Оскар". Тэлегульня.

ГРТ

8.00, 11.00, 14.00, 17.00, 23.15 Навіны.
8.15, 17.20 "Новая ахвяра".
9.05 Футбол. Ліга чэмпіёнаў.
11.10 Тэлерадыёкампанія "Мір".
11.55 "Расійскі транзіт" М.ф., 5-я ч.
12.50 Мультфільм.
13.15 Брэйн рынг.
14.20 Мультсерыял.
14.45 Лего-го!
15.10 Цін-Тонік.
15.40 "Элен і хлопцы".
16.05 Рок-урок.
16.30 Па старонках перадачы "Клуб падарожнікаў".
18.05 Час пік.
18.30 "Грай, гармонік любімы!"
19.00 "Мая сям'я".
19.45 Добрай ночы, малышы!
20.00 Час.
20.40 "Неба і зямля". М.ф.
23.25 "Абоз".
0.15 "Пятніца, 13".

"Расія"

6.00 Ранішні экспрэс.
6.25 На дарозе на працу.
6.35 "Мак і Матлі".
7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 23.00 Вестці.
7.20 Ранішні экспрэс-2.
7.50 Экспавеснік.
8.00 Рэтра-шлягер.
8.25 "Дарагая рэдакцыя..."
8.55, 19.30 "Санта-Барбара".
9.50, 23.25 Тавары — поштай.
10.20 "Небяспечны паварот". М.ф., 2-я ч.
16.20 Блак-нот.
16.35 "Чэленджэрс".
17.05 Лота-Мільён.
17.20 Пецярбургскія сезоны.
17.45 "Цёмная" для Н.Бетанэлі.
18.00 Новае пятае кола.
18.40 Асабліва важныя персоны.
20.30 "Пэн і Тэлер". Забаўляльная праграма.
21.05 "Вандроўнік". М.ф., 1-я ч.
22.00 Лі Страсберг у праграме "Багема".
23.35 Музыка ўсіх пакаленняў.
23.50 "Хто на што здатны".
0.05 "Не спі і глядзі".

Санкт-Пецярбург

11.55, 14.00, 15.55, 18.55, 23.45 Інфарм ТБ.
12.10, 19.20 "Партрэт жанчыны". 3-я ч.
13.10 Тэрмін адказу — сёння.
13.45, 20.50 Тэлеслужба бяспекі.
14.15, 21.15 "Дэмпсі і Мейкпіс".
15.05 Мультфільм.
15.15 Фантазія на тэмы кахання.
16.10 Парадоксы гісторыі.
16.40 "Інспектар Гэджэт".
17.05 Дзіцячае ТБ.
18.40 Вялікі фестываль.
19.15 Спорт.
20.20 Асабістая справа.
21.05 Спартыўны агляд.
22.05 Падзея.
22.25 Музычнае шоў.
23.05 Хакей.

НТБ

17.00 "Дзеці супраць монстраў". 7-я ч.
17.30 "Вуліца Сезам".
18.00, 21.00, 23.00 Сёння.
18.35 Герой дня.
19.00 Футбол. Кубак кубкаў.
21.35 "Тайныя злачынствы". М.ф., 6-я ч.
22.30 Часінка.
23.20 "Восем з паловай". М.ф.

Пятніца, 1 лістапада

Беларускае тэлебачанне

7.30 Ранішні кактэйль.
7.50, 18.35 Эканамікст.
8.00, 15.00, 18.50, 0.25 Навіны.
8.15 "Яшчэ не вечар...".
8.30 Бархатны сезон.
9.00 "Варвара-краса, Доўгая Каса". М.ф.
10.20 Студыя "Калыханка".
10.50, 19.35 "Трапічная спёка". 6-я ч.
11.50 "З душой". Д.ф.
12.20 "Гракі". М.ф.
15.10 "Капітан Фракас". М.ф., 2-я ч.
16.15 Мультфільмы.
16.45 Кантрасты. Прававая праграма.
17.15 "Крок". "Правінцыя".
17.25 "Дні і вечары Тэатра юнага гледача Беларусі".
19.00 Рэферэндум: шчырая размова.
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.55 Адкрыццё Міжнароднага фестывалю "Залаты шлягер".
0.40 "12, ці На ноч глядзячы".

ГРТ

11.00, 14.00, 17.00, 23.10 Навіны.
11.10 Тэлерадыёкампанія "Мір".
11.55 "Расійскі транзіт" М.ф., 6-я ч.
12.50 Мультфільм.
13.10 Брэйн рынг.
14.20 Мультсерыял.
14.45 Сустрэча з кампазітарам Я.Крылатавым.
15.00 "Укралі няню!"
15.40 "Элен і хлопцы".
16.05 Дзеючыя асобы.
16.30 Па старонках перадачы "Клуб падарожнікаў".
17.20 "Новая ахвяра".
18.15 Чалавек і закон.
18.45 Поле цудаў.
19.45 Добрай ночы, малышы!
20.00 Час.
20.40 "Памерці няма калі". М.ф.
22.25 Погляд.
23.20 "Аднойчы побач". М.ф.

"Расія"

6.00 Ранішні экспрэс.
6.25 На дарозе на працу.
6.35 "Мак і Матлі".
7.00, 10.00, 16.00, 19.00, 23.00 Вестці.
7.20 Ранішні экспрэс-2.
7.50, 9.50, 23.25 Тавары — поштай.
8.00 Рэтра-шлягер.
8.25 "Дарагая рэдакцыя..."
8.55, 19.30 "Санта-Барбара".
10.20 Гандлёвы дом. "Ле Монці".
10.35 "Небяспечны паварот". М.ф., 3-я ч.
16.20 Блак-нот.
16.35 Графаман.
16.45 Імперыя гульняў.
17.35 Крок за крокам.
17.45 Вертыкаль.
18.10 Бясконцае падарожжа.
18.40 Асабліва важныя персоны.
20.30 Сам сабе рэжысёр.
21.10 "Каханне". М.ф.
23.35 Музыка ўсіх пакаленняў.
23.50 "Слухаць пададзена". Эстрадны спектакль.

Санкт-Пецярбург

11.55, 14.00, 15.55, 18.55, 23.45 Інфарм ТБ.
12.10, 19.20 "Партрэт жанчыны". 4-я ч.
13.00 Тэрмін адказу — сёння.
13.45, 20.50 Тэлеслужба бяспекі.
14.15, 21.15 "Дэмпсі і Мейкпіс".
15.05 Мультфільм.
15.15 Музычнае шоў.
16.10 Ток-шоў "Наўздагад".
16.40 "Інспектар Гэджэт".
17.05 "Павана Маўра". Муз.ф.
18.40 Вялікі фестываль.
19.15 Спорт.
20.20 Я — геній.
21.05 Спартыўны агляд.
22.05 Падзея.
22.25 Як быць каханымі.
22.10 "Раман імператара". М.ф., 3-я ч.

НТБ

17.00 "Дзеці супраць монстраў". М.ф., 8-я ч.
17.30 Футбольны клуб.
18.00, 21.00, 23.00 Сёння.
18.35 Герой дня.
19.00 "Ён сваё атрымае". М.ф.
20.35 Група "Насця".
21.35 "Тайныя злачынствы". М.ф., 6-я ч.
23.20 "Кампанія ваўкоў". М.ф.
0.55 Эратычныя шоў свету.

Субота, 2 лістапада

Беларускае тэлебачанне

Дзень памяці (Дзяды)

8.00 Беларускі дом. "Спадчына".
8.15 Радавод.
8.55 Існасць.
9.25 Беларускі мерыдыян.
9.55 "Усё пра ўсё".
10.20 "Калі мяне не стане". Д.ф.
10.45 Шматгалоссе.
11.15 "Крок". "Вандроўнік".
11.30 "Дрэвы на асфальце". М.ф.
12.45 "Ёсць толькі імгненні..."
13.05 Алімп: ад падножжа да вяршыні.
13.25 Майстэрня.
13.45 Калаж.
14.15 Памяці актрысы. Галіна Маркіна.
14.45 Студыя "Акно".
15.10, 17.15 Тэлесябрына.
15.45 "Габелены мастачкі Вольгі Дзёмкінай".
16.15 Беларускі дом.
16.55 "Гісторыя кахання".
18.00 Галерэя.
18.30 Конны спорт. Міжнародныя спаборніцтвы.
19.05 "Шляхціц Завальня". М.ф.
20.40 Калыханка.
21.00 Навіны.
22.05 "Чаканне палкоўніка Шалыгіна". М.ф.
23.30 Цёмны пакой. Бульварная літаратура.

ГРТ

7.00 "У матросаў няма пытанняў". М.ф.
8.45 Хатняя бібліятэка.
9.00, 14.00, 17.00 Навіны.
9.10 Слова пастыра. Мітрапаліт Кірыл.
9.30 Не зявай!
10.00 Ранішняя пошта.
10.40 Смак.
11.00 Траццякоўка. Гісторыя аднаго шэдэўра.
11.30 "Цыёт". М.ф.
13.30 Пад знакам "Пі".
14.20 "Вяртанне на востраў скарбаў". 9-я ч.
15.10 Амерыка з М.Таратутам.
15.40 Бацькоўскі "тэрарызм".
16.00 Ціна Тэрнер.
16.15 "Кола гісторыі".
17.20 "Ералаш".
17.50 У свеце жывёл.
18.30, 20.50 "Місія ў Кабуле". М.ф., 1-я і 2-я ч.
19.45 Добрай ночы, малышы!
20.00 Час.
22.10 "Каламбур".
22.40 "Адбітак зла". М.ф.

"Расія"

7.00 Лукамор'е.
7.25 Мультфільм.
8.05 "Мак і Матлі".
8.20 Мультфільм.
8.35 Па вашых пісьмах.
8.55 Кніжная лаўка.
9.20 Крамлёўскія навіны.
10.00 Вестці ў адзінаццаць.
10.15 "Здароўе".
10.30 Добрай раніцы.
11.00 Урача выклікалі?
11.30 Ананімныя суразмоўцы.
12.00 "Паэт у Расіі — больш, чым паэт".
12.30 Працэй простага.
13.00, 19.00, 23.35 Вестці.
13.20 "Тайна Сахары". М.ф.
14.15 "Нічога, акрамя..."
14.30 Дэ факта.
15.00 Музыка на дэсерт.
15.20 Сад культуры.
15.45 Свая гульня.
16.15 Брыльянты сусветнага балета.
16.55 Міжнародны жаночы турнір па тэнісу.
17.55 "Каралева Марго". М.ф., 16-я ч.
19.35 Суботні вечар: прысвячаецца Аркадзію Райкіну.
21.05 Зусім сакрэтна.
22.00 "Буянства". М.ф.
23.50 Праграма "А".

Санкт-Пецярбург

9.25 Па рацэ плыве сякера.
9.55, 11.55, 15.55, 18.55 Інфарм ТБ.
10.10 "Гонар маю".
10.40 Памяці Уладыкі Іаана.
11.10 Ток-шоў "Наўздагад".
11.40 Страсці-мардасці.
12.10 Хакей. Чэмпіянат Расіі.
14.15 Яшчэ адна Расія.
14.40 Тэатральная правінцыя?
15.10 Спартыўны агляд.
15.25 Парадоксы гісторыі.
16.10 "Экстрасэнс".
16.40 Восень — Царскае Сяло.
17.05 "Раўнаецца каханне..."
18.40 Вялікі фестываль.
19.25 "Мільён за разгадку".
19.40 Мультфільм для дарослых.
19.50 "Тры дні на роздум" М.ф., 1-я ч.
20.55 Свецкая хроніка.
21.10 Блеф-клуб.
21.50 "Парад парадаў" прадстаўляе. Навінкі сезона.
22.30 "Раман імператара". М.ф., 4-я ч.

НТБ

17.00 "Дзеці супраць монстраў". 9-я ч.
17.30 "Дог-шоў. Я і мой сабака".
18.00, 21.00 Сёння.
18.30 "Крымінальная Расія: сучасныя хронікі". Д.ф.
19.00 "Тайныя злачынствы". М.ф. Закл. ч.
20.00 Надоечы.
20.45 Лялькі.
21.35 "Айчым". М.ф.
23.45 Трэцяе вока.
0.30 "Плэйбой".

Нядзеля, 3 лістапада

Беларускае тэлебачанне

8.00 Кола часу. Лістапад.
8.30 Здароўе. Узроставыя асаблівасці здароўя падлеткаў.
9.05 "Конан".
9.30 Студыя "Калыханка".
10.05 Мультфільм.
10.15 Тэлебом.
10.45 Вяршыня свету. Тэлегульня.
11.05 Арсенал.
11.40 "Усё нармальна, мама!".
12.10 Тураб'ектыў.
12.40 Міжнародны кур'ер.
13.10 Тэлевізійны АРТ-клуб.
13.40 "Вяскоўцы".
14.10 "Вайна ў паветры". Д.ф., 9-я ч.
14.40 "Адзіная прастора — мора".
15.40 Вяршыня свету.
16.00 Гандбол. Адборачны матч чэмпіянату свету.
17.20 Тэніс. Міжнародны прафесійны турнір сярод жанчын.
17.55 Абібок.
18.25 "Залаты шлягер".
19.40 Калыханка.
20.00 Рэзананс.
20.50 Спартыўны тэлекур'ер.
21.10 Навіны-ТБ.
21.25 Ток-шоў "Карамболь".
22.00 "Вольнае падзенне". М.ф.
23.40 Бархатны сезон.
0.10 Відзьма-навідзьма.

ГРТ

6.55 "Школьны вальс". М.ф.
8.30 Мультфільм.
9.00, 14.00, 22.10 Навіны.
9.15 Бесталковыя нататкі Д.Крылова.
9.30 Пакуль усе дома.
10.10 Ранішняя зорка.
11.00 Служу Расіі!
11.30 Грай, гармонік любімы!
12.00 Правінцыяльныя гісторыі.
12.30 "Падводная адысея каманды Кусто".
13.25 Смехапанарама.
14.20 Клуб падарожнікаў.
15.10 Мультфеерверк.
15.55 Чэмпіянат Расіі па футболе.
18.05 Шчаслівы выпадак.
19.00 Час.
19.40 "Маскоўскія канікулы". М.ф.
21.40 Футбольны агляд.
22.20 "Новыя амерыканскія графіці". М.ф.

"Расія"

7.00 Лукамор'е.
7.30 Мультфільм.
7.50 Спортлато.
8.00 "Мак і Матлі".
8.20 Мультфільм.
8.30 Пілігрым.
9.00 Вуснамі дзіцяці.
9.30 Прысяга.
10.00 Вестці ў адзінаццаць.
10.15 Расійскае лато.
10.55 Прыз групы "Савва".
11.00 Чалавек на Зямлі.
11.25 Кніжная лаўка.
11.55 Тэлетэатр. "Ездавы Капешкін".
12.25 Працэй простага.
13.00, 23.00 Вестці.
13.20 "Атрад "Д". М.ф.
14.40 Нічога, акрамя...
14.55 У свеце жывёл.
15.25 Караоке па-расійску.
15.55 Рэпарцёр.
16.10 Футбол без межаў.
16.40 "Ва ўсіх на вуснах" з Н.Дар'ялавай.
17.00 Чароўны свет Дыснэя.
18.00 "Каралева Марго". М.ф., 17-я і 18-я ч.
19.00 Люстэрка.
20.55 Рэпартаж ні аб чым.
21.10 "Фрак народа".

Санкт-Пецярбург

9.25 "Тата, мама і я — спартыўная сям'я".
9.55, 11.55, 13.55, 15.55, 18.55 Інфарм ТБ.
10.10 Авертайм.
10.40 "Неўтаймаваная Афрыка". М.ф., 2-я ч.
11.10 "Старое танга". В.Ковель.
11.30 Мультфільм.
11.40 Увесь гэты цырк.
12.10 "Вяселле ў Малінаўцы". М.ф.
13.35 Мультфільм.
14.10 Яшчэ адна Расія.
15.10 Незавершаны партрэт.
16.10 Спартыўная праграма.
16.35 Дзіцячае ТБ.
18.40 Скарбы Пецярбурга.
19.25 Спявае Алена Апіна.
19.40 "Тры дні на роздум" М.ф., 2-я ч.
20.55 Ва ўсіх на вачах.
21.10 Ноў смокінг.
21.55 Міжнародны агляд.

НТБ

17.00 "Дзеці супраць монстраў". 10-я ч.
17.30 Тэлегульня "Сто да аднаго".
18.00 Сёння.
18.30 Праграма У.Познера "Чалавек у масцы".
19.10 "Зніклыя цывілізацыі". 9-я ч.
20.00 Вынікі.
21.10 Сузор'е НТБ.
23.15 "Усе ладзі робяць гэта".

Століншчына ў "Беларусі"

Кніга — крыніца ведаў. Гэтую аксіёму пацвярджае выдадзены напрыканцы мінулага года ў выдавецтве "Беларуская Энцыклапедыя" энцыклапедычны даведнік "Беларусь". У ім упершыню ў гісторыі краіны пад адной вокладкай сабраны звесткі пра ўсе асноўныя сферы жыццядзейнасці Беларусі. На 800 старонках кнігі змешчана 4800 артыкулаў, у тым ліку 1618 біяграфічных даведак, 1370 ілюстрацый, карт і схем. Выключна важная роля выдання кнігі належыць яе галоўнаму рэдактару — вядомаму беларускаму пісьменніку і кнігалюбу Барысу Іванавічу Сачанку, які раптоўна памёр незадоўга да падпісання даведніка ў друк.

Рэдакцыйная калегія паліčыла мажлівым каля паўтара дзесятка разоў звярнуцца да нашае Століншчыны. Дадзены падрабязная карта і характарыстыка аднаго з буйнейшых раёнаў Берасцейшчыны, абрысаваны яго геаграфічнае, сацыяльна-эканамічнае становішча, вылучаны гістарычныя адметнасці. Асобныя артыкулы прысвечаны археалагічным помнікам у Атвержычах, Вялямічах, Дубаі, Хотамлі. Як маючыя гістарычную каштоўнасць адзначаны многія цэрквы. Напрыклад, Прачысцінская царква ў в.Дубянец, Міхайлаўская цэрквы ў вёсках Рубель і Рамель і інш. Вёска Гарадная пазначана як старажытны цэнтр ганчарнага рамяства. У артыкуле "Скульптура драўляная" названыя работы нашага знакамітага скульптара-разьбяра І.Супрунчыка. У пяці асобных артыкулах даюцца апісанні старажытнага Давыд-Гарадка. Літаратурная Століншчына прадстаўлена вядомым беларускім паэтам Леанідам Дранько-Майсюком.

Кніга складзеная з прыкметным праадраджэнскім ухілам, дзякуючы чаму чытачы маюць магчымасць пазнаёміцца з многімі рупліўцамі беларушчыны. Гэта і надта добра. Безумоўна, у аднатомным даведніку цяжка ўсебакова і поўна адлюстраваць краіну з яе шматвяковай гісторыяй, назваць тысячы вядомых сыноў і дачок, якія таго заслугоўваюць. Ці не таму ў ім і не знайшлося хоць маленечкага куточка для адзінай на Берасцейшчыне героя-настаўніцы Кавалец Надзеі Іванаўны. Не, не трэба было прысвячаць усім героям асобных артыкулаў, але назваць іх прозвішчы пры характарыстыцы рэгіёнаў, на маю думку, укладальнікі даведніка павінны былі б. Бо неяк няёмка адыджацца, забываючы цяперашніх лепшых сыноў і дачок краіны — герояў Беларусі.

Кніга разлічана на шырокае кола чытачоў, на ўсіх, хто хацеў бы "атрымаць дакладную інфармацыю пра краіну, размешчаную ў самым цэнтры Еўропы — Рэспубліку Беларусь", як адзначае рэдакцыйная калегія ва ўступе да яе.

Шкада, што даведнік выдадзены мізэрным накладам — усяго 5 тысяч паасобнікаў на 10-мільённую краіну. Таму, відаць, і цана на яго "кусачая". Каму ж пашанцавала набыць даведнік "Беларусь", той можа лічыць сябе шчаслівым.

Леанід РАМАНЕНКА.
в.Рамель Столінскага р-на.

Лепшым драматычным спектаклем на міжнародным тэатральным фестывалі "Белая вежа-96" названы спектакль "Ідылія" па п'есе В.Дуніна-Марцінкевіча ў пастаноўцы Беларускага Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я.Купалы. Яму прысвоены Гран-пры фестывалю.
На здымку: Зоя Белахвосцік і Георгій Маляўскі ў спектаклі "Ідылія".
Фота Р.КАБЯКА, БелТА.

Афарызмы
(З кітайскіх скарбаў)

— Прагнучы даведацца пра ўсе справы свету чытайце старыя кнігі.
— Навуковец — скарб сваёй краіны.
— Як у люстэрку можна бачыць форму, так праз мінулае можна пазнаць сучаснасць.
— Кнігі не маюць у сабе ўсіх слоў, а словы — усіх думак.
— Не варта забіваць вала, які арэ зямлю, не варта выкідаць паперу, на якой штосьць надрукавана.
— Праўда як вялікая дарога: даступная кожнаму.
— Адна ноч гутаркі з мудрацом замяніць дзесяць гадоў навукі.
— Замест каб радзіць іншым, радзь самому сабе.
— За чужое меркаванне лепшы свой уласны вопыт; лепшае "бачыў", чым "чуў".
— Вочы бачаць праўду, вушы чуюць фальш.
— Вялікая дарога праўды і абавязку ясная і простая, але абманшчыкі выбіраюць крывую.
— Неба ніколі не закрывае чалавеку дарогі.
— Лепей ураталіць адно чалавечае жыццё, чым збудаваць сяміпавярховую пагаду.
— Калі не слухаеш бацькоў, ці ж не будуць дарэмнымі твае добрыя ўчынкі?
— Святар можа ўявіць цябе ў бажніцу, але выкананне дабрадзецелі залежыць ад самога цябе.

Даты і падзеі ў кастрычніку

25 — (па 27) першыя зімовыя дні паводле старадаўняга ісландскага календара. (Год дзяліўся на зіму і лета).
— 60 гадоў з дня нараджэння кінарэжысёра Віктара Турава, народнага артыста Беларусі, народнага артыста СССР.
26 — 65 гадоў з дня нараджэння Эрнста Дарашэвіча, філосафа, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі.
27 — 85 гадоў з дня нараджэння Міколы Лобана, пісьменніка, мовазнаўца.
— 85 гадоў таму ў Віцебску адкрылася аддзяленне Маскоўскага археалагічнага інстытута. На першы курс запісалася 58 чалавек.
— 80 гадоў з дня нараджэння разьбяра Дзмітрыя Сакажынскага.
28 — 530 гадоў з дня нараджэння Эразма Ратэрдамскага, галандскага асветніка і гуманіста, вешчуна Рэфармацыі, вучань якога Ваяводка быў першым друкаром у Берасцейскай друкарні.
— 70 гадоў таму ў заходнебеларускай газеце "Народная справа" адзначана 20-годдзе беларускага легальнага друку.
— 50 гадоў з дня нараджэння мастачкі Л.М.Сцяпанавай.
30 — Дзень палітзняволеных (Дзень памяці ўсіх ахвяраў рэпрэсіяў).
— 75 гадоў таму пачаліся заняткі на двух асноўных факультэтах: медыцынскім і грамадскіх навук Беларускага дзяржаўнага універсітэта.
— 60 гадоў з дня нараджэння мовазнаўца Генадзя Цыхуна, доктара філалагічных навук.
31 — 125 гадоў з дня нараджэння М.А.Панова, рэжысёра, драматурга, мастацкага кіраўніка БДТ-1 у 20-я гады.
— 50 гадоў з дня нараджэння мастака М.Федарэнкі.

У кастрычніку:
— 495 гадоў таму вялікі князь ВКЛ і кароль Польшчы Аляксандр выдаў Мельніцкі прывілей, які пашырыў паўнамоцтвы магнатаў у палітычным жыцці ВКЛ.
— 270 гадоў таму выйшла з друку кніга Джанатана Свіфта "Падарожжы Гулівера" — самы антыанглійскі твор гэтага славутага ірландскага пісьменніка. Адным з вядомых выказванняў Дж.Свіфта было: "*Паліце ўсё англійскае, апроч іх вугалю*".
— 130 гадоў таму здаўся апошні паўстанец (паўстання 1863 г.) з атрада Трусава.
— 120 гадоў таму царскімі ўладамі была выкрыта прыватная беларуская школа В.Дуніна-Марцінкевіча, што існавала ў ягоным маёнтку Люцынка.
— 70 гадоў таму Язэп Варонка пачаў выдаваць у Чыкага газету "Беларуская трыбуна".
— 70 гадоў таму выйшаў першы нумар часопіса "Чырвоны сейбіт", літаратурна-мастацкі дадатак да газеты "Беларуская вёска".

Падрыхтаваў З.С.

Дзяржаўны камітэт Рэспублікі Беларусь па друку выказвае глыбокае спачуванне родным і блізкім з выпадку смерці пісьменніка Аляксандра Пятровіча Капусціна.

І смех і грэх

Пачутае "У Лявона"

ПРАЯВЫ

Аматар конных гонак звоніць псіхіятру:
— Шаноўны, маёй жонцы ад учарашняга дня здаецца, што яна стала канём і рыхтуецца да гонак. Вось і цяпер пасецца на газоне каля дома.
— Я дапускаю, што гэта нервовы шок на вашыя бясконцыя размовы пра коней і конныя спаборніцтвы. Але вам трэба прывесці яе да мяне дзеля абследавання. І як мага хутчэй.
— Добра, зараз яе асядлаю.

ПАЛОВА ЎЧЫНКУ

— Ты абяцаў зрабіць добры ўчынак...
— На жаль, выканаў толькі напалову.
— І што ж ты зрабіў?
— Перавёў старэнькую праз вуліцу.
— То чаму сказаў, што напалову?
— Бо яна спатыкнулася і ўпала.

ДОБРЫ НАМЕР

Маладзён радзіцца з Лёляй:
— Я намерыўся прасіць рукі адной дзяўчыны. Што вы скажаце на гэта?
— Добры намер, калі шаноўны мае на ўвазе маю дачку.

СВЕДКА

Сужонцы разводзяцца. Суддзя звяртаецца да сведкі:
— Ці былі вы сведкам таго ракавога ўчынку?
— Так, спадар суддзя, я быў сведкам на іх шлюбе.

А ПАСЛЯ?

— Пяць гадоў таму я была самай шчаслівай.
— А пасля?
— Пазнаёмілася з сваім мужам...

НАВІНА

— Кажуць, што ў вашым заапарку ўжо можна кармiць і дражніць звяроў...
— Але за даляры!

ПАГАНЫ САБАКА

На выставу самых паганых сабак забінтаваны мужчына прыводзіць бульдога:
— А каб бачылі, як ён грызе чужых!

Чуў З.С.

Прэса-куламеса

У нашу хуткаімклівы час хочацца як найкарацей выказваць думкі. Перыядычны друк дзякуючы кампутарнаму набору і карэктарам паказвае ў гэтым напрамку арыгінальныя ўзоры. Вось некаторыя:

"Я хачу сябраваць з Расіяй, як і з усімі іншымі краінам".
"Народная воля".

"Под **впчатлением** утреннего разговора..."
"Здравый смысл".

"От каб такія тэлефны ды ў кожны кабінет чыноўніка".
"Народная газета".

"Зрух у масавай свядмасці..."
"Літаратура і мастацтва".

"Яны **ведаць** мовы і знаходзяць магчымасць цікава і творча падарожнічаць".
"Літаратура і мастацтва".

Без лекаў сапраўды зарыкаеш

"Дарэчы, каштуюць яны досыць танна, прынамсі, намнога танней, чым усё, што прадаецца сёння на **рыку** медыцынскіх паслуг".
Там жа.

"А калі ўважліва прачытаеш усе выступленні.., то паўстае цэласная карціна шляху беларускага яўрэйства на тэрыторыі Беларусі, відочна, таго як шмат зрабілі яўрэі дзеля развіцця літаратуры, мастацтва, культуры".
Там жа.

А вось у адносінах сінтаксічнай логікі нечага не дарабілі.
Я.К.

Колькі новых дзяржаў!

"— Што такое Народная Рэспубліка Мроя?
— Гэта дзяржава ў дзяржаве. Як **Вытыкан**".
"Літаратура і мастацтва".

Узнагароджваюць... прaграмай

"20.45. Цырымонія ўручэння штогадовай расійскай музычнай **праграмы** "Зорка".
"Звязда".

Як нашы ўнунтраныя справы?

"Прыйшоў час, калі новы наркам **Унунтраных** спраў БССР Л.Цанава, які змяніў на гэтай пасадзе Наседкіна, палічыў патрэбным інфармаваць першага сакратара ЦК Панамарэнку аб ходзе і выніках праведзенай работы..."
"Літаратура і мастацтва".

Падрыхтавала Л.ШНІП.

У старых фаліянтах

ВЫПАДАК

Падчашы Вялікага Княства Літоўскага Юзаф Масальскі, сын польнага гетмана ВКЛ Міхала Масальскага, невялікага быў росту. Да таго ж надужыванне моцных напояў надвярэдзіла ягонае здароўе. Улюбёным заняткам маладога князя, які жыў у Ляхавіцкім замку, былі ловы.

Аднойчы князь Караль Радзівіл наладзіў у Слуцкай пушчы вялікае паляванне. Запрошаныя былі госці ці не з усяго княства. Гетман Масальскі сам не паехаў, нібы баючыся, што Радзівіл пасля ловаў напросіцца да яго ў госціну разам з усёй грамадою. Замест яго паехаў сын ды прывёў з сабою ўсю псарню, у тым ліку і трох хартоў, пра якіх у наваколлі Ляхавічаў распавядалі байкі ды жарты.

Аграмадны Радзівілаўскі замак, вядома ж, не мог змясціць усіх гасцей, а таму шмат хто спыніўся ў Нясвіжы, а за горадам, вайсковым абозам разлеглася пад шалашамі грамада стральцоў, паганятых, калейнікаў, а таксама пару тысячаў мясцовага люду, сагнанага з вакольных вёсак дзеля аблавы. У дзень святога Губерта (3 лістапада) пачаліся ловы. На світанні князь Радзівіл у зялёным кунтушы, у таго ж колеру шапцы, аблямаванай чорнай смушкай, з ордэнам святога Губерта — патрона паляўнічых, атрыманага ад баварскага электара, выехаў конна з Нясвіжа разам з гасцямі. А сярод тых былі і такія, хто ў брычцы ехаў, а былі таксама і "партызаны" — немалая чарада. Меневіта гэтыя аматары, ідучы з фузеямі ў руках, ужо па дарозе спрабавалі шчасця-ўдачы: ці часам не ўпалююць зайца або ліса.

...У пушчы парастаўлялі стральцоў, і на голас трубы княжага лоўчага рушыла паўтарамілевая аблава, спусцілі з прывязі і 50 сабачых зграяў...

Князь Масальскі, упэўнены ў сваёй лоўкасці і смеласці ды, вядома ж, добра ведаючы мясцовасць, дзе не адзін раз паляваў, пакінуў лінію стральцоў і пайшоў у глыб пушчы. Ды толькі ён спыніўся на аблюбаваным мейсцы, як убачыў аграмаднага мядзведзя. Маладзён, не спалохаўшыся, падпусціўшы яго крокаў на дваццаць, стрэліў і трапіў у бок — мядзведзь перакуліўся, але адразу ж устаў і на двух лапах, равучы, рушыў на стральца. Масальскі, не трацячы галавы, кідае разладаваную стрэльбу ды, схаваўшыся за дрэва, выцягвае корд і рыхтуецца да рукапашнай. Але ў гэтую ж хвіліну чуе за сабою стрэл — куля каля вуха візгнула — мядзведзь падае нежывы.

Выпадак з Масальскім стаўся тэмай агульнай гутаркі. Адны хвалілі ягонае мужнае захаванне і адвагу, але пераважна дзівіліся, як то можна не забіць мядзведзя, страляючы з дваццаці крокаў...

Падчашы Масальскі, знайшоўшы свайго збавіцеля, радзівілаўскага лесніка, падаў яму жменю грошай, кажучы: "Мой браце, прымі гэты малы ўпамінак ад мяне і будзь упэўненым аб маёй удзячнасці".

— Даруй, княжа,— перапыняе яго Радзівіл,— але мой слуга мною адным толькі ўзнагароджаным быць павінен. Пане Сурвіла,— абярнуўся ён да лесніка,— паступіў сёння ты годна, як шляхцічу ды меткаму і адважнаму стральцу быць належыць — ураптаваў ты жыццё самай буйной галіне гетманскага дрэва князёў Масальскіх.

Гэтыя словы патанулі ў рогаце, бо Масальскі быў малы ростам, шчуплы, хударлявы. А Радзівіл з ironіяй працягваў:

— Я перакананы, што гетман Масальскі, чалавек такі ж шчодры і найлепшы бацька, абсыпаў бы цябе золатам, але гэта не ад яго, а толькі ад мяне залежыць. Аддаю табе вашэці Шнельцы — брод і засценак на Случчыне і загадваю выплацiць табе сто чырвонцаў золатам на заснаванне гаспадаркі. Ляснік кінуўся да ног Радзівіла, а малады Масальскі можа больш чым перад мядзведзем і ад злосці губу сабе аж да крыві прыкусіў...

Пасля ловаў працягвалася гулянка, а малады Масальскі паехаў у Ляхавічы, адзінокі, пакінуўшы далёка за сабою свaіх слугаў, толькі любімыя харты беглі каля яго...

Вычытаў З.С.

Заснавальнік: ТБМ імя Ф.Скарыны.
АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220029, г.Менск, вул.Чычэрына, 1. Тэлефон: 233-17-83.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:
Эрнэст Ялугін — галоўны рэдактар, Лявон Баршчэўскі, Янка Брыль, Анатоль Бутэвіч, Радзім Гарэцкі, Ніл Гілевіч, Вольга Кузьміч, Анатоль Клышка, Уладзімір Ламека, Уладзімір Панада, Зміцер Санько, Здзіслаў Сіцька, Яўген Цумараў, Генадзь Цыхун.
Адказны сакратар — Уладзімір Аніськовіч.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за дакладнасць фактаў і іншых звестак. Пункт гледжання аўтара можа не адлавядаць меркаванню рэдакцыі. Рукапісы рэдакцыя не рэцэнзуе і назад не вяртае.
Індэкс 63865. Замова 1154

Друкарня выдавецтва "Беларускі Дом друку". 220041, г.Менск, пр. Ф.Скарыны, 79.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Наклад 2754 паасобнікі.
Падпісана ў друк 23.10.1996 г. у 15 гадзін.